Рэха
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
БУДЗЬМА!
№2 СНЕЖАНЬ 2008
БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

У НУМАРЫ:

Берасцейцы ў арміі Андэрса 1, 14-17
Даследчык П. Баброўскі 8-9
Памяці А. Цвікевіча 11-13

БЕРАСЦЕЙЦЫ—ЖАЎНЕРЫ АРМІІ АНДЭРСА

Да пытання ўдзелу нашых землякоў у Другой сусветнай вайне ў складзе II Польскага корпуса

Угледзьцеся ў твары на гэтых фотаздымках. Што іх аб'ядноўвае? Тое, што ўсе гэтыя людзі—ўраджэнцы Берасцейшчыны, якія ўдзельнічалі ў Другой сусветнай вайне ў складзе Арміі генерала Андэрса.

У савецкія часы іх імёны былі занядбаныя і не ўносіліся ў летапіс змагароў з фашызмам. Ды і ўвогуле, за свае заслугі гэтыя людзі ад савецкай улады атрымалі "узнагароду" ў выглядзе ссылкі ў Сібір.

Чым жа яны правініліся?

Адказ на гэтае пытанне палягае ў самой сутнасці савецкага таталітарызму, які ў той час меў манаполію на вызначэнне як герояў, так і ворагаў.

Сёння ж аднаўленне гістарычнай справядлівасці немагчыма без вяртання незаконна рэпрэсаваных імёнаў…

На гэтых фотаздымках далёка не ўсе Берасцейцы, якія змагаліся ў Арміі Андэрса. Іх значна больш. Але пералічым жа імёны гэтых змагароў, вярнуўшы ім тым самым даніну павагі: Павел Нічыпарук (Кобрыншчына), Мікалай Кот (Ганцаўшчына), Аляксандр Лемяшэўскі (Піншчына), Дзмітрый Прыбалтавец (Століншчына), Васіль Бышка (Драгічыншчына), Уладзімір Палто (Іванаўшчына), Іосіф Нічыпаровіч (Пружаншчына), Аляксандр Аўдзяйчук (Століншчына), Васіль Мішкоў (Століншчына), Павел Улезла (Пружаншчына), Мікалай Натынчык (Піншчына), Міхаіл Лоска (Драгічыншчына).

Гэтыя фотаздымкі сабраў і прадаставіў да друку Яўген Гурэўскі, даследчык тэмы ўдзелу берасцейцаў у Арміі Андэрса, краязнавец з Пінска.

Рэдакцыя выказвае падзяку спадару Яўгену за той унёсак, які ён робіць для адраджэння гістарычнай памяці.

Калонка рэдактара

Шаноўнае спадарства!

Другі нумар гісторыка-культурніцкага бюлетэня "Рэха Берасцейшчыны" прысвечаны, у першую чаргу, тэме удзелу беларусаў, берасцейцаў у Другой сусветнай вайне ў польскай арміі пад кіраўніцтвам генерала Андэрса.

Аднак кранаем на старонках нашай газеты і іншыя тэмы, сярод якіх гістарычныя, краязнаўчыя, літаратурныя матэрыялы ад аўтараў з розных рэгіёнаў Берасцейшчыны.

Акрамя таго, будзем мы старацца знаёміць Вас з ідэямі, меркаваннямі і дзейнасцю на гісторыка-культурніцкай ніве розных грамадскіх, палітычных дзеячоў нашага рэгіёну. Так, у гэтым нумары мы гутарым з кіраўніком Берасцейскай філіі Партыі БНФ Дзмітрыем Шыманскім.

Вельмі важнай падзеяй з'яўляецца старт кампаніі "Будзьма" па развіцці і папулярызацыі беларускай культуры. Да гэтай кампаніі ўжо далучыліся цэлы шэраг выбітных беларускіх культурных, навуковых і грамадскіх дзеячоў. Цалкам раздзяляючы мэты кампаніі "Будзьма", мы таксама далучаемся да яе і будзем інфармаваць Вас, шаноўныя чытачы, аб асноўных мерапрыемствах кампаніі на Берасцейшчыне.

Падсумоўваючы ўсё вышэй сказанае, хочацца яшчэ падзякаваць Вам, шаноўныя чытачы, за тыя словы ўдзячнасці, якія былі накіраваны ў рэдакцыю "Рэха Берасцейшчыны" пасля выхаду першага нумару.

У сваю чаргу, мы ізноў запрашаем да супрацы краязнаўцаў, навукоўцаў, літаратараў, і проста неабыякавых да роднай культуры і гісторыі людзей. Пішыце нам на каардынаты, пазначаныя ў канцы газеты, або тэлефануйце.

Дзякуем таксама ўсім аўтарам, якія падтрымалі нас падчас працы над другім нумарам.

Павел ДАЙЛІД,
РЭДАКЦЫЯ "РЭХА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ"

СТАРТАВАЛА КАМПАНІЯ "БУДЗЬМА"

БУДЗЬМА!

Галоўнае пра гэтую кампанію:

1. Ідэя кампаніі:

У сучасным зменлівым свеце найбольш цэняцца самабытнасць, пачуццё годнасці і яснае бачанне перспектывы.

Беларусы вартыя быць паспяховым народам.

Поспех магчымы толькі ў адзінстве.

Аб'яднаць беларусаў можна на глебе павагі да сябе, сваёй краіны, яе гісторыі, культуры і мовы.

Беларус – гэта кожны грамадзянін Беларусі, незалежна ад нацыянальнага паходжання.

Веданне, культуры, гісторыі і мовы сваёй краіны дае чалавеку адметнасць сярод іншых народаў.

Будзьма беларусамі – гэта нас аб'ядноўвае і робіць унікальнымі!

2. Мэты кампаніі:

Абудзіць у жыхароў Беларусі інтарэс да культуры сваёй краіны.

Заахвоціць беларусаў да ўсведамлення беларускай культуры як уласнай каштоўнасці.

Мы хочам, каб жыхары нашай краіны прамаўлялі слова "беларус" з годнасцю.

Мы хочам аб'яднаць беларусаў.

3. Рэалізацыя кампаніі:

Мы будзем ладзіць шматлікія культурныя і асветніцкія акцыі па ўсёй Беларусі: лекцыі па беларускай гісторыі і культуры, канцэрты беларускіх музыкаў і гуртоў, выставы нашых найлепшых мастакоў, сустрэчы з пісьменнікамі, прэзентацыі кніг, часопісаў і музычных праектаў і шмат іншага.

4. Як далучыцца кампаніі:

Да кампаніі можна далучыцца як персанальна, так і калектыўна: арганізацыяй ці ініцыятывай. Кантакты каардынатараў кампаніі: + 375 29 6320092 (Алена Макоўская), + 375 29 6258378 (Ніна Шыдлоўская), + 375 29 6273550 (Севярын Квяткоўскі).

5. Удзел у кампаніі:

Удзельнікам кампаніі можа стацца кожны, хто піша свае навіны на сайт budzma.org, наведвае імпрэзы кампаніі, распаўсюджвае інфармацыю пра кампанію. Таксама можна звярнуцца да каардынатараў "Будзьма!" з прапановай арганізаваць імпрэзу пад лозунгам кампаніі. Кампанія "Будзьма!" паспрыяе прыезду ў ваш горад беларускага літаратара, мастака, музыканта ці навукоўца.

6. Асвятленне кампаніі:

"Будзьма!" публікуе анонсы сваіх мерапрыемстваў ды іншую інфармацыю, звязаную з кампаніяй на сайце **budzma.org**.

БУДЗЬМА!
WWW.BUDZMA.ORG

ФОТАКОНКУРС "БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ !"

Адкрытая грамадская кампанія "Будзьма!" 20 кастрычніка абвясціла конкурс фотаздымкаў. Прапанаваныя на конкурс здымкі павінны ўяўляць сабою дакументальнае ці мастацкае ўвасабленне вобразаў, партрэтаў і сітуацый, якія ў аўтараў асацыююцца з Беларуссю ці беларусамі.

Пераможцы конкурсу будуць вызначаны ў наступных **намінацыях:**

1. **"Людзі Беларусі"** (асобы і характары нашых суайчыннікаў)
2. **"Краіна Беларусь"** (краявіды і сітуацыі, якія падкрэсліваюць унікальнасць нашай краіны)
3. **"Будзьма еўрапейцамі!"** (беларускія асобы, сюжэты і вобразы, якія паказваюць нашу еўрапейскасць)

Усе працы павінны мець наступныя звесткі: імя і прозвішча (па жаданні - нікнэйм), поўная дата нараджэння, зваротны электронны адрас, пажадана кантактныя тэлефоны.

Прымаюцца фотаздымкі вагой не больш за 1 мегабайт.

Фотаконкурс "Будзьма беларусамі!" будзе доўжыцца **ад 20 кастрычніка 2008 г. да 31 сакавіка 2009 г.**

Журы конкурсу: Міхал Анемпадыстаў, Андрэй Лянкевіч, Анатоль Кляшчук.

Штомесяц будуць падводзіцца вынікі па кожнай з трох намінацый. Працы-пераможцы за месяц будуць выстаўляцца на інтэрнэт-старонцы **www.budzma.org**, а іх аўтары будуць урачыста ўзнагароджаныя прызамі ад кампаніі "Будзьма!".

У сакавіку 2009 г. сярод штомесячных пераможцаў будуць вызначаныя лаўрэаты "Гран-пры" конкурсу ва ўсіх намінацыях. Апрача каштоўнага прызу, кожны з іх атрымае магчымасць займець персанальную старонку ў Інтэрнэце.

Адрас для дасылкі: **razam@budzma.org**
Кантактныя тэлефоны:
+ 375 29 627 35 50,
+ 375 29 853 55 77

НАВІНЫ КАМПАНІІ “БУДЗЬМА” НА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЕ

“Мы не бачыліся цэлае каханне…”

Такім вершаваным радком пачаў 26 лістапада свой выступ перад студэнтамі філалагічнага аддзялення Брэсцкага дзяржаўнага універсітэту паэт Леанід Дранько-Майсюк. Сустрэча праходзіла ў межах кампаніі “Будзьма!”.

Апошні раз у Брэсце паэт выступаў у 2005 годзе. За гэты час ён паспеў напісаць дзве новыя кнігі. “Калі б не паэзія Янкі Купалы, Максіма Багдановіча і Якуба Коласа, якую я чуў з вуснаў маці ад малых гадоў, я мог бы стаць багатым “мешчанінам” у давыдгарадоцкай кветкавай гільдзіі, а так я стаў самым багатым на вершы пра каханне беларускім паэтам…”, падсумаваў свой выступ Леанід Дранько-Майсюк.

Узнёсла і запамінальна выступіў паэт-бард Эдуард Акулін. Сведчаннем ягонага поспеху была доўгая чарга студэнтак па аўтограф і пацалунак ад “барда кахання й пачуцця” на памяць аб доўгачаканай сустрэчы.

Другое спатканне мінскія паэты ладзілі ў Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.С.Пушкіна.

Сюды паслухаць “сталічных мэтраў” (так паэтаў прадставіла гаспадыня бібліятэкі С.М.Сямашка) прыйшлі студэнты Брэсцкага чыгуначнага каледжа і навучэнцы Брэсцкага ліцэю сувязі.

www.budzma.org

Маладыя журналісты разважалі пра еўрапейскае Берасце

На працягу месяца ў горадзе над Бугам па ініцыятыве мясцовай філіі Беларускай асацыяцыі журналістаў праходзіў конкурс журналісцкіх прац па тэме “Праз Брэст у Еўропу”.

На электронную скрыню конкурсу прыйшло больш за 20 прац, а гэта артыкулы, вершы, фотарэпартажы і прэзентацыі, у якіх моладзь разважае над еўрапейскім мінулым і будучыняй роднага горада Берасця ў Еўропе. У намінацыі “Артыкул па тэме “Праз Брэст у Еўропу” перамагла Яўгена Мароз са сваёй працай “Фартыфікацыйныя ўмацаванні”. У намінацыі “Фотаадлюстраванне ” Праз Брэст у Еўропу” лепшымі прызнаныя працы Аляксандра Шульгача. Лепшым мастацка-літаратурным творам стаў верш Вікі Лукашук “Любовь к себе, любовь к стране…”. Спецыяльным прызам у намінацыі “На роднай мове пра родныя мясціны” адзначаная Хаўрылюк Мая за прэзентацыю на беларускай мове “Горад над Бугам”.

Пераможцы і ўдзельнікі конкурсу атрымалі падарункі ад БАЖу і кампаніі “Будзьма”.

Прадстаўнікі “Будзьма” распавялі пра мэты кампаніі і тыя мерапрыемствы, што ладзяцца ў межах кампаніі па ўсёй краіне.

Больш падрабязна пра гэта расказаў Алег Супрунюк, кіраўнік Берасцейскай філіі БАЖ:

- Наша арганізацыя адна з самых вялікіх па колькасці сярод філій БАЖу. Таму ў нас ёсць разнастайныя праекты. Адзін з апошніх - конкурс, які мы абвясцілі для маладых творчых асобаў, якія пакуль вучацца ў школах, з’яўляюцца студэнтамі, але ў тым ліку мараць і пра прафесію журналіста. Мне падалося што для першага разу было даволі шматлюдна, у тым сэнсе, што было нямала цікавых і разнастайных артыкулаў, фотаздымкаў. Увогуле людзі праявілі сябе падчас гэтага конкурса неабыякавымі да гісторыі нашага краю.

Конкурс скончыўся, але гэта толькі першы этап вялікага праекту “Праз Брэст у Еўропу”. Пра далейшыя мерапрыемствы ў межах праекту распавядае адна з яго арганізатараў Жанна Сідарук:

- Мы вырашылі актывізаваць юных журналістаў нашага рэгіёна для таго каб яны пісалі пра свой горад, яго ўнікальнасць, пра еўрапейскі характар Берасця, пра тое як сябе адчуваюць людзі, якія тут жывуць, што можна паглядзець гасцям. І на нашу прапанову адгукнулася каля 20 чалавек. Мы падвялі вынікі, узнагародзілі лепшых. Але запрасілі да далейшага ўдзелу ў семінарах усіх удзельнікаў. Спадзяемся яны аб гэтым не пашкадуюць і будуць больш актыўна супрацоўнічаць з нашымі берасцейскімі недзяржаўнымі газетамі. Далей мы плануем правесці семінары па журналістыцы, звязаныя менавіта з тэмай гэтага конкурсу, а потым правесці 5 прэс-тураў па нашай вобласці, каб маладыя журналісты змаглі свае тэарэтычныя веды выпрабаваць на практыцы.

www.budzma.org

“БУДЗЬМА” ІДЗЕ Ў ШКОЛУ”

Пад такім дэвізам у сярэдняй школе №25 горада Брэста ў межах кампаніі “Будзьма!” прайшла акцыя “Забаўляльна-разважальная віктарына для дзетак” сярод навучэнцаў восьмых класаў.

Ініцыятарам віктарыны стаў Павел Белавус, студэнт Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта і сябра мясцовай моладзевай суполкі “Дзедзіч”, які на момант правядзення віктарыны праходзіў практыку ў школе.

Адмыслова для віктарыны было складзена 20 пытанняў з варыянтамі адказаў па беларускай гісторыі, культуры, літаратуры, геаграфіі. Пытанні былі разлічаныя на дзяцей да 8 класа і складзеныя такім чынам, каб праз пошук правільных адказаў школьнікі запаміналі самыя цікавыя і важныя факты пра Беларусь.

Усе ўдзельнікі атрымалі прыемныя падарункі ад кампаніі “Будзьма”.

www.budzma.org

“Будзьма” ў Варацэвічах

24 снежня 2008 года на радзіме мастака Напалеона Орды, ў вёсцы Варацэвічы Янаўскага раёна Брэсцкай вобласці, у мастацкай галерэі музейнага комплексу, які носіць яго імя, адкрылася выстава, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Язэпа Драздовіча.

Удзячныя сваім папярэднікам мастакі суполкі “Пагоня” Беларускага саюза мастакоў аддалі даніну пашаны і памяці Язэпу Драздовічу, прысвяціўшы ягонаму юбілею адмысловую выставу, якая вандруе амаль па ўсёй Беларусі. Гасцінна сустрэлі Варацэвічы Аляксея Марачкіна і Тодара Ладуцьку, мастакоў з Мінска, якія прыехалі на прэзентацыю экспазіцыі. Дырэктар карціннай галерэі Зміцер Казак прывітаў прысутных, падзякаваў за такі своеасаблівы навагодні падарунак, які зрабіла творчая суполка “Пагоня”.

Больш за 30 твораў жывапісу і графікі размешчаныя ў дзвюх залах галерэі. Сярод іх палотны Уладзіміра Сулкоўскага, Ігара Марачкіна, Генадзя Драздова, Георга Скрыпнічэнкі, Ігара Бархаткова, Ягора Батальёнка — усіх не пералічыць

На адкрыцці экспазіцыі прысутнічалі вучні Янаўскай мастацкай школы, якой кіруе сябра суполкі “Пагоня” Янка Рамановіч.

Пры адкрыцці выставы адбылася прэзентацыя культурніцкай кампаніі “Будзьма!”. Аляксей Марачкін кожнаму з удзельнікаў сустрэчы зрабіў падарункі ад кампаніі “Будзьма”, дзякуючы якой мастацкія выставы трапляюць у самыя аддаленыя ад сталіцы куточкі нашай краіны…

Выстава “Нябесныя бегі – Вечны вандроўнік” будзе доўжыцца ў Варацэвічах да 28 студзеня 2009 года, а пасля пераедзе ў Ліду.

www.budzma.org

“СЯРОД МОЛАДЗІ СТАНОВІЦЦА МОДНЫМ

Беларускаму Народнаму Фронту нядаўна споўнілася 20 гадоў. Гэта было шырока адзначана дэмакратычнай грамадскасцю Берасцейшчыны. Нам удалося пагутарыць з кіраўніком Берасцейскай абласной філіі Партыі БНФ Дзмітрыем Шыманскім і задаць яму пытанні наконт гісторыка-культурнай пазіцыі Партыі.

Дзмітрый Шыманскі, кіраўнік Берасцейскай абласной філіі Партыі БНФ

Спадар Дзмітрый, як вы ацэньваеце гэты перыяд дзейнасці БНФ для гісторыі нашай краіны, якія значныя дасягненні Вы можаце назваць?

У 1988г. ля вытокаў БНФ стаялі знакамітыя пісьменнікі, паэты, мастакі і вучоныя: Васіль Быкаў, Максім Танк, Рыгор Барадулін, Янка Брыль, Уладзімір Арлоў, Генадзь Бураўкін і Стэфанія Станюта. Стварэнне гэтай арганізацыі адыграла значную ролю ў станаўленні і развіцці Беларусі ў посткамуністычны перыяд. Менавіта сябры БНФ у Вярхоўным Савеце ініцыявалі прыняццё Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, дзякуючы Народнаму Фронту нацыянальным сімвалам беларусаў быў вернуты дзяржаўны статус, пачалося сапраўднае Адраджэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь. БНФ і зараз цвёрда стаіць на пазіцыях незалежнасці і эканамічнага росквіту Беларусі, паслядоўна адстойвае дэмакратычныя правы і свабоды яе грамадзян.

Акрамя гэтага, менавіта Фронт паслядоўна выкрываў злачынствы камуністычнага рэжыму ў Беларусі: Фронт адкрыў беларусам праўду пра Курапаты і іншыя рэпрэсіі супраць нашага народу. Дамогся праўды аб сапраўдных наступствах Чарнобылю і аб злачынным стварэнні над Магілёўшчынай штучных дажджоў з радыёактыўных аблокаў, якія рухаліся на Маскву.

Спадар Дзмітрый, акрэсліце, калі ласка, асноўныя пазіцыі партыі ў гісторыка-культурным плане.

Беларуская культурная традыцыя пабудаваная на такіх еўрапейскіх прынцыпах, як рэлігійная і ідэалагічная талерантнасць, павага да асобы і яе правоў, шанаванне законаў. Мы бачым еўрапейскую перспектыву Беларусі ў зберажэнні нацыянальнай адметнасці. Беларуская гістарычная памяць і беларуская мова - каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць наш народ. Знакамі свабоды, незалежнасці, адраджэння былі і ёсць нашыя нацыянальныя сімвалы - бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоня.

Мы выступаем за вяртанне беларускай мове рэальнага статусу дзяржаўнай і заканадаўчае вызначэнне статусу моваў нацыянальных меншасцяў, за стварэнне беларускамоўнай сістэмы адукацыі ад дзіцячых садкоў да ўніверсітэтаў.

Я лічу, што Беларусь павінна стаць не краінай-музеем савецкай таталітарнай эпохі, а краінай музеяў, турыстычным цэнтрам.

Чаго чакаць ад партыі ў галіне гісторыка-культурніцкай дзейнасці ў бліжэйшы перыяд на Берасцейшчыне?

Сур'ёзныя дыскусіі ў грамадстве ідуць вакол усталявання ў Берасці помніка да 1000-гадовага юбілею горада. Пытанняў ў берасцейцаў накапілася вельмі шмат: ад таго, чаму помнік 1000-годдзя трэба ўсталёўваць да 990-й гадавіны, чаму збор сродкаў на яго ідзе пад прымусам і заканчваючы таемнай і непразрыстай працэдурай выбару праекта помніка. Апошняй кропляй стала рашэнне аб зняцці з помніка фігуры Ягайлы, які дараваў Берасцю Магдэбурскае права. Супраць фігуры Ягайлы выступілі прадстаўнікі Рускай праваслаўнай царквы. У бліжэйшы час БНФ ініцыюе круглы стол экспертаў, навукоўцаў і грамадскасці па абмеркаванні праблемы. Мяркую, што будзем выходзіць з прапановай адкласці ўсталяванне помніка і правесці шырокі і адкрыты конкурс праектаў.

Іншы напрамак – стварэнне макета старажытнага Берасця на тэрыторыі Берасцейскай крэпасці. Маштабнасць задумак архітэктараў не столькі ўражвае, сколькі пужае. Мяркую, што неабходны кантроль грамадства над праектаваннем і рэалізацыяй гэтай ідэі. І тут Фронт не застанецца ўбаку.

Але акрамя культурных праблем, якія набылі вялікі грамадскі рэзананс, Фронт займаецца і іншымі, менш “раскручанымі” справамі: мы аказваем дапамогу грамадскім арганізацыям і прыватным асобам, якія займаюцца асветніцкай і выдавецкай дзейнасцю, збіраюць фальклор, вывучаюць гісторыю. Садзейнічаем пашырэнню кантактаў паміж навукоўцамі і культурнымі установамі Беларусі з краінамі-суседзямі.

Як Вы лічыце, у якім стане знаходзіцца ахова гісторыка-культурнай спадчыны на Берасцейшчыне?

Як і па ўсёй краіне – на самым прымітыўным. Ёсць ахова, яна сама па сабе, і ёсць гісторыка-культурная спадчына, яна сама па сабе. У нас не створана адпаведная заканадаўчая база: навукоўцы, археолагі не маюць рычагоў уздзеяння, каб кантраляваць ход работ на аб'ектах, якія маюць гістарычную каштоўнасць, каб пры патрэбе нават прыпыніць распачатае будаўніцтва ці рэстаўрацыю. Апошні прыклад – знішчэнне брукаванкі на вул. Савецкай у Берасці, якую выпадкова знайшлі падчас рамонту вуліцы. У

Берасце. Святкаванне 20-годдзя Беларускага Народнага Фронту.

РАЗМАЎЛЯЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ”

Еўропе найбольшую каштоўнасць мае гісторыя. Брукаванка, як яе частка, ёсць ці не ва ўсіх еўрапейскіх гарадах. У нас, нажаль, пакуль галоўнае – пакласці плітку ў тэрмін і згодна з праектам.

Хто на Ваш погляд, з’яўляецца ўвасабленнем сапраўднага беларуса?

Васіль Быкаў, Ларыса Геніюш.

У Ірландыі большасць насельніцтва гаворыць па-англійску. Ірландская мова гучыць толькі ў глухіх вёсках сярод найстарэйшых жыхароў. Аднак урад гэтай краіны выдзяляе велізарныя грошы на падтрымку роднай мовы. Там існуе нават тэлеканал цалкам на ірландскай мове. Якая ж будучыня беларускай мовы, можа яна знікне як лаціна?

Не памрэ беларуская мова, як лацінская, гэта дакладна. Спадзяюся, што не застанецца яна і ў такім бядацкім стане, як ірландская. Для адраджэння беларускай мовы патрэбна 2 простыя і ў той жа час складаныя рэчы: стварыць адпаведныя умовы, не наламаўшы дроваў, як у пачатку 90-х, і запасціся цярпеннем, бо гэта будзе вымагаць шмат часу. Праз 2 пакаленні, недзе гадоў праз 50 беларуская мова вернецца ўва ўсёй сваёй прыгажосці ва ўсе сферы нашага жыцця.

Якія умовы? Павінна быць распрацавана і прынята Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы. Найперш – заахвоціць бацькоў, каб яны выбіралі паўсюдна менавіта беларускую мову навучання для сваіх дзяцей. Забяспечыць дзіцячыя садкі, школы, каледжы і ўніверсітэты падрыхтаванымі беларускамоўнымі кадрамі. І, натуральна, свараць беларускамоўнае атачэнне для нашых дзяцей паўсюль – ад тэлевізараў да грамадскага транспарту, ад дзіцячых кавярняў да паліклінік. А самае галоўнае – падтрымка Дзяржаўнай праграмы з боку бацькоў.

Чаму сённяшнія улады ня любяць БНФ? Баяцца, што вы прымусіце іх гаварыць па-беларуску?

Яны баяцца не БНФ. Яны баяцца дэмакратыі, увасабленнем якой для іх з’яўляецца БНФ. У дэмакратычных умовах у сённяшніх праўладных палітыкаў не было б ніводнага шанса атрымаць падтрымку большасці насельніцтва на выбарах любога ўзроўня – ад прэзідэнцкіх да выбараў сельсаветаў. Коснаязыкія, непісьменныя, не ведаючыя ані беларускай ані рускай мовы, адарваныя ад рэальнага жыцця за плотамі сваіх катэджаў, яны чапляюцца за ўладу, бо нічога іншага рабіць проста не ўмеюць. Гэта элементарнае нежаданне расставацца з уладай. Сённяшнія ўлады – тыя ж самыя камуністы, якія своечасова перафарбаваліся “на патрабаванне часу”. І пакуль яны сядзяць на сваіх месцах, не будзе ў Беларусі Адраджэння – ані культурнага, ані эканамічнага. Мы так і застанемся на перыферыі Расеі замест таго, каб жыць у цэнтры Еўропы.

Як Вы лічыце, ці ўвядзенне так званай “дзяржаўнай ідэалогіі” не супярэчыць Канстытуцыі нашай краіны? Якім чынам “дзяржаўная ідэалогія” ўплывае на гістарычную навуку ў краіне, нашым рэгіёне?

Як ні дзіўна, гістарычная навука – вельмі гнуткая, яе лёгка можна мяняць пад патрэбы таго ці іншага палітыка. Бо можна ж пры выкладанні гісторыі ў школах казаць пра сталінскія рэпрэсіі, а можна прамаўчаць. Можна казаць пра вынішчальныя войны Масковіі з ВКЛ, падчас якіх расейцы знішчалі да паловы насельніцтва нашай зямлі, а многія гарады, у тым ліку і Берасце, наогуле стаялі пустымі. А можна казаць пра братэрства і еднасць нашых народаў. Вяртаючыся да Берасцейшчыны, можна казаць пра славутага сына нашай зямлі Тадэвуша Касцюшку, а можна ставіць помнікі і адкрываць музей у Кобрыні ў гонар Аляксандра Суворава, які бязлітасна задушыў паўстанне Касцюшкі ў крыві, забіваючы мімаходзь і жанчын і нават немаўлят. А наколькі ідэалогія ўплывае на навуку, хай вырашаюць самі навукоўцы.

Ці праўда, што сённяшняе пакаленне маладых людзей яшчэ больш абыякавае да роднай культуры, гісторыі?

Адназначна не. Зараз беларусы, у тым ліку і маладыя, усё больш пачынаюць адчуваць сябе нацыяй. Адсюль і павышэнне цікавасці і маладых людзей і дарослых да вывучэння сваёй гісторыі, культуры. Больш за тое, у Менску, у некаторых абласных цэнтрах сярод моладзі, асабліва студэнцкай, становіцца папулярным, я бы сказаў модным размаўляць па-беларуску. І гэта прыемна.

Ці толькі “чаркай і шкваркай” павінен жыць беларус? Да чаго імкнуцца?

Не так шмат беларусаў жыве толькі “чаркай і шкваркай”. Працавіты і таленавіты, беларус у першую чаргу дбае пра свой дом, пра сваю сям’ю, пра сваіх дзяцей і іх будучыню. Іншая справа, што прызвычаіўшыся за амаль тры стагоддзі да прыгнёту і рэпрэсій, беларус прыняў за аксіёму прынцып “мая хата з краю”. Не высоўвайся, будзь такім, як усе – так вучаць сваіх дзяцей беларусы. І гэта вельмі дрэнна. Трэба думаць не толькі пра сваю сям’ю, але і пра краіну, вучыцца браць на сябе адказнасць за яе будучыню!

Гутарыў Павел ДАЙЛІД

БАЖ абвяшчае конкурс

“Помнікі роднага краю”

Да ўвагі выхаванцаў школ маладога журналіста, школ мастацтваў, агульнаадукацыйных школ, выхаванцаў краязнаўчых і мастацкіх гурткоў.

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» сумесна з ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» абвяшчае дзіцячы конкурс «Помнікі роднага краю».

Мэта конкурсу – прыцягнуць увагу маладых грамадзян Беларусі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй «малой радзімы». Запрашаем да ўдзелу дзяцей ва ўзросце ад 5 да 16 гадоў.

На конкурс прымаюцца журналісцкія матэрыялы, краязнаўчыя працы, эсэ, малюнкі, прысвечаныя архітэктурным і гісторыка-культурным помнікам Беларусі. Вітаюцца працы пра малавядомыя гістарычныя мясціны нашай краіны, пра забытыя і закінутыя помнікі.

Працы на конкурс прымаюцца да 1 сакавіка 2009 года.

Усе конкурсныя працы мусяць быць падпісаныя. На зваротным баку малюнкаў трэба напісаць імя і прозвішча ўдзельніка конкурсу, яго ўзрост, хатні адрас і тэлефон. Тыя ж звесткі (імя і прозвішча ўдзельніка, ўзрост, хатні адрас і тэлефон) павінныя быць пазначаныя таксама пад кожным артыкулам ці эсэ, дасланым на конкурс.

Мова конкурсных прац – беларуская і руская. Аб’ём працы – не больш за 4 друкаваныя старонкі 12-ым кеглем.

Пераможцы конкурсу будуць ушанаваныя. **Лепшыя працы і малюнкі ўвойдуць у друкаваную кнігу «Мая Беларусь».**

Свае працы трэба дасылаць на адрас: **220030, г. Мінск, пл. Свабоды, 17-304 з пазнакай «На конкурс “Помнікі роднага краю”».**

ВАЙНА З БЕЛАРУСКАЙ

За савецкім часам гісторыі Беларусі як асобнага прадмету ў навучальных праграмах сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў БССР проста не існавала. Яна была неабавязковым дадаткам да гісторыі СССР (фактычна - Расіі). Толькі пасля распаду Савецкага Саюзу, калі гістарычная навука вызвалілася ад партыйнага кантролю, і паўстала патрэба абнаўлення гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з новымі палітычнымі рэаліямі, становішча з выкладаннем гісторыі Беларусі змянілася.

Ужо ў 1991 г. быў апублікаваны праект новай канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў Беларусі, з якога і пачаліся рэальныя перамены. У адпаведнасці з ім з 1992 г. прадмет "гісторыя СССР" касаваўся і далучаўся да курсу гісторыі сусветнай, а гісторыі Беларусі ўпершыню надаваўся статус самастойнай дысцыпліны. Асноўныя прынцыпы прынятай канцэпцыі арыентавалі выкладанне гісторыі на ўсведамленне нацыянальнай адметнасці Беларусі, адраджэнне гістарычнай памяці і нацыянальнай свядомасці, на выхаванне патрыётаў Беларусі незалежна ад нацыянальнасці. Вызначаным у канцэпцыі прыярытэтам адпавядала і новая праграма гістарычнай адукацыі, якая была распрацавана аўтарытэтным калектывам вучоных і педагогаў пад кіраўніцтвам Міхася Біча і пасля апрабацыі ў газетах выйшла ў свет асобным выданнем. Паводле гэтай праграмы да пачатку 1993/94 навучальнага году спецыялісты падрыхтавалі 20 новых дапаможнікаў па гісторыі, выдадзеных на беларускай мове. У іх упершыню ў Беларусі гісторыя разглядалася не з класавых, а з агульнанацыянальных пазіцый, вытокі беларускай дзяржаўнасці звязваліся з Полацкім княствам і Вялікім Княствам Літоўскім, адкрыта гаварылася пра спусташальныя войны, якія вялі на беларускай зямлі маскоўскія цары, а пры асвятленні найноўшай гісторыі аўтары выразна адмоўна ацэньвалі таталітарную савецкую сістэму.

Прапанаваная новымі падручнікамі трактоўка мінулага Беларусі радыкальна адрознівалася ад традыцыйнай савецкай і выклікала раздражненне актыўных прыхільнікаў старога рэжыму. Рэальныя ўмовы для іх наступу на гісторыкаў дэмакратычнай арыентацыі і для вяртання савецкае візіі мінулага стварыў прыход да ўлады Аляксандра Лукашэнкі ў 1994 годзе. Невыпадкова адразу пасля змены дзяржаўнай сімволікі новае кіраўніцтва Беларусі жыва зацікавілася беларускай гістарычнай навукай і ўзялося прыводзіць яе інтэрпрэтацыйныя мадэлі ў адпаведнасць з савецкім бачаннем мінулага. З гэтага моманту гістарычная адукацыя ў краіне стала полем найвастрэйшых спрэчак і трапіла ў поле асаблівай увагі дзяржаўных ідэолагаў.

Спецыяльная нарада прэзідэнта з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі 23 жніўня 1995 г. вырашыла часова дазволіць карыстацца "нацдэмаўскімі" падручнікамі, а новыя, альтэрнатыўныя, падрыхтаваць на наступны год. Для праверкі і выпраўлення навучальнай літаратуры па гісторыі стварылі спецыяльную Дзяржаўную камісію пры Кабінеце Міністраў. Камісію ўзначаліў кіраўнік Галоўнага ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі У. Замяталін. У склад камісіі ўвайшла пераважна старая прафесура сталінска-савецкай школы, у прыватнасці гісторыкі Пётр Петрыкаў, Аляксандр Філімонаў, Валеры Чарапіца, філосаф Вячаслаў Дашкевіч і інш. Так у Беларусі быў адкрыта ўзяты курс на перавод гістарычнай адукацыі на новыя (старыя!) ідэалагічныя рэйкі, а фактычна - на яе рэсаветызацыю, на вайну з беларускай гісторыяй.

Узяўшыся прасейваць тэксты школьных выданняў праз сіта ідэалагічнай цэнзуры, Дзяржаўная камісія дбала пра адпаведнасць іх зместу не столькі гістарычнай праўдзе, колькі ідэалагічнай лініі Лукашэнкавага рэжыму. Асаблівую ролю ў кампаніі супраць новых падручнікаў і нацыянальных падыходаў у гістарыяграфіі выконвала грамадскае аб'яднанне "Гістарычныя веды", створанае ўвесну 1996 г. Згуртаваўшы некалькі дзесяткаў навукоўцаў старога веку, якія абвясцілі сябе "защитниками и сторонниками советской государственности и советской власти", яно прысвоіла сабе ролю своеасаблівага экспертнага органу, які стаў надзіва аўтарытэтным у дзяржаўных вярхах... У праграмным звароце, апублікаваным у прэсе, гэтая група, узначаленая прафесарам Адамам Залескім, заявіла, што будзе весці "борьбу против фальсификаций событий прошлого", выкарыстоўваючы "мировой опыт революций и контрреволюций". Невыпадкова "барацьбітоў з фальсіфікацыяй" найбольш непакоіла асвятленне падзей апошняй вайны, ацэнка партызанскага руху і савецкага ладу. Аднак займала іх і далёкае мінулае. Напрыклад, у падручніку "Гісторыя Беларусі XVI-XVIII стст." для 7 класу (аўтар П. Лойка) крытыкі бачылі "русафобства", не прымалі станоўчай ацэнкі царкоўнай уніі 1596 году і г. д., у "Гісторыі Беларусі. Канец XVIII ст. - 1917 г." (аўтар М. Біч) зноў жа катэгарычна не прымалі "русафобскіх" пазіцый аўтара і таго, што ён пакінуў без станоўчай ацэнкі "великое событие" - падзелы Рэчы Паспалітай і ўключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі, а ў падручніку для 9 класу "Гісторыя Беларусі 1917-1992 гадоў" (аўтары В. Сідарцоў і В. Фамін) іх раздражняла адно ўпамінанне пра тое, што ў савецкай дзяржаве існавалі "антынародны таталітарны рэжым" ды "нацыянальны і культурны прыгнёт".

Дзяржаўная камісія ўважліва сачыла за зместам навучальных выданняў не толькі па беларускай, але і па сусветнай гісторыі. Так, з падручніка "Сусветная гісторыя найноўшага часу" для 9 класу (Менск, 1998) яна выкрасліла як тлумачэнне тэрміну "таталітарызм", так і ўсё, што сведчыла пра супрацоўніцтва Савецкага Саюзу з гітлераўскай Нямеччынай, а таксама пра негатыўную ролю Сталіна і яго віну ў развязванні другой сусветнай вайны.

Адначасова з крытыкай "крамольных" выданняў прадстаўнікі старой савецкай школы пачалі пісаць свае, сапраўды альтэрнатыўныя дапаможнікі, у якіх ацэнкі падзеям і эпохам расстаўляліся ў поўнай адпаведнасці з ідэалагічным курсам рэжыму. Напрыклад, у дапаможніку Васіля Мілаванава "Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. - 1917 г." для 8 класу, які выйшаў у 1998 годзе, падзелы Рэчы Паспалітай трактуюцца як "прагрэсіўнае дзеянне", што дало беларусам "магчымасць скінуць з сябе прыгнёт польска-літоўскіх феадалаў". Наступнай альтэрнатывай для вучняў 11 класу стала "Гісторыя Беларусі. Канец XVIII ст. - 1999 г." пад рэдакцыяй Яўгена Новіка. Расійскі генерал Міхаіл Мураўёў, якога за жорсткасць пры падаўленні нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863-64 гадоў празвалі "вешальнікам", у гэтым дапаможніку паўстаў "энергічным дзяржаўным дзеячам, які з веданнем справы рабіў тое, да чаго быў закліканы", а дэнансацыя дагавору аб утварэнні СССР, заключанага ў 1922 г., і паўстанне СНД названыя дзяржаўным пераваротам.

Пад не менш пільнай увагай уладаў апынулася і гістарычная адукацыя ў вышэйшай школе. Яшчэ да пачатку яе рэсаветызацыі Інстытут гісторыі НАН Беларусі паспеў выпусціць "Нарысы гісторыі Беларусі" у 2-х частках (Менск, 1994-95), якія грунтуюцца на нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Гэта была першая сінтэза айчыннай гісторыі, створаная ў суверэннай Беларусі. Некалькі гадоў яна выкарыстоўвалася як дапаможнік для студэнтаў ВНУ, што зусім не адпавядала новай дзяржаўнай палітыцы ў галіне вышэйшай адукацыі. Выпраўляць сітуацыю ўзяліся "прыдворныя" гісторыкі, і ўжо ў 1998 г. у якасці ідэалагічнай антытэзы акадэмічным нарысам выйшаў дапаможнік для ВНУ "Гісторыя Беларусі" ў 2-х частках, падрыхтаваны калектывам гісторыкаў-выкладчыкаў. Яго аўтары настолькі захапіліся выкананнем палітычнай замовы, што дапусцілі безліч фактаграфічных памылак, асвятляючы беларускае мінулае з пазіцый старой расійскай і савецкай гістарыяграфіі. Атрымалася мяккая рэдыцыя гісторыі "Паўночна-Заходняга краю", якая выклікала абурэнне не толькі навуковай грамадскасці, але і студэнтаў.

Пасля абвяшчэння курсу на перагляд падручнікаў і з'яўлення публікацый членаў клубу "Гістарычныя веды" з палітычнымі

"Пагоня".
Герб Беларусі 1991—1996 гадоў
Створаны на базе гістарычнага герба Вялікага княства Літоўскага— нашай сярэднявечнай дзяржавы.

ГІСТОРЫЯЙ

абвінавачваннямі апанентаў у сферы гістарычнай навукі і адукацыі запанавала нездаровая атмасфера. Сітуацыю асабліва абвастрыла публікацыя адкрытага ліста групы старых гісторыкаў-артадоксаў да А. Лукашэнкі з красамоўнай назвай "Работа по восстановлению исторической правды подвергается яростному сопротивлению со стороны национал-экстремистов". У адказ Рада Беларускай асацыяцыі гісторыкаў выступіла з заявай, у якой рашуча пратэставала супраць навешвання ярлыкоў і спробаў вярнуць гістарычную навуку Беларусі да часоў бальшавізму. Аднак улады адкрыта занялі бок невялікага кола савецкіх артадоксаў, што ўзяліся "ўзнаўляць гістарычную праўду".

Ва ўзніклых умовах кожная спроба пераглядзець савецкую гісторыю сутыкалася з бурнай рэакцыяй ветэранаў вайны і актыўных прыхільнікаў Лукашэнкі са славяна-патрыятычных колаў. Асабліва паказальны прыклад з даследчыкам сталінскіх рэпрэсій Ігарам Кузняцовым, які з-за сваіх публікацый быў так ашальмаваны імі ў прэсе, што мусіў бараніць свой гонар у судзе.

Фактычна з 1996 году ў Беларусі была ўведзена палітычная цэнзура на гістарычную літаратуру. Адной з першых з планаў выдавецтва "Мастацкая літаратура" на 1996 г. чыноўнікі выключылі ўжо падрыхтаваную да друку кнігу Ў. Арлова і Г. Сагановіча "Дзесяць вякоў беларускай гісторыі" (а таксама творы Васіля Быкава і Ларысы Геніюш), якая, на іх думку, была "напісаная тэндэнцыйна ў русафобскім напрамку", хоць праца прайшла сур'ёзную экспертызу ў Інстытуце гісторыі, які рэкамендаваў яе да выдання. У 1997 г. пасля негалоснага рашэння невядомых адпаведных асобаў быў спынены продаж папулярнай кнігі Ў. Арлова "Адкуль наш род". Але сапраўдным сімвалам увядзення цэнзуры ў краіне стала выдаленне гербу Пагоня з вокладкі чарговага, трэцяга тому "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (1996). Гэта зрабіла новае кіраўніцтва выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя", намеснікам галоўнага рэдактара якога быў прызначаны Пётр Петрыкаў - былы дырэктар Інстытуту гісторыі, адзін з самых актыўных апалагетаў савецкага мінулага. Ён выступіў з жорсткай крытыкай ранейшага кіраўніцтва энцыклапедыі, сцвярджаючы, што галоўнай адметнасцю першых тамоў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" быў "ярка выражаны антырусізм, а ў многіх выпадках зацятая русафобія". Прывёўшы ў прыклад некаторыя артыкулы, напісаныя супрацоўнікамі Інстытуту гісторыі, П. Петрыкаў абвінаваціў гэтую ўстанову ў тым, што яна ажыццяўляе "татальную фальсіфікацыю" гісторыі. Беспадстаўны і палітычны характар падобных закідаў паказалі дырэктар Інстытуту гісторыі Міхаіл Касцюк і яго намеснік Міхаіл Біч, якія ўступілі ў палеміку з былым калегам, аднак гэта не адвяло хмараў, якія пагрозліва згушчаліся над дырэкцыяй інстытуту.

Пры новых кіраўніках выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя" канцэпцыя чарговых тамоў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" на хаду мянялася, і нават падрыхтаваныя да друку артыкулы вярталіся на цэнзуру. П. Петрыкаў, напрыклад, паўсюль выкрэсліваў слова "русіфікацыя", не прапускаў ніякай крытыкі ў бок Расіі ды савецкай улады і г. д. З-за грубага ўмяшання ў тэксты многія гісторыкі (у прыватнасці, Валянціна Вяргей, Андрэй Кіштымаў, Уладзімір Конан, Мікола Крывальцэвіч, Генадзь Сагановіч і інш.) адмовіліся ад далейшага супрацоўніцтва з выдавецтвам і забралі адтуль свае артыкулы.

Кампанія супраць галоўнай фартэцыі "фальсіфікатараў" - акадэмічнага Інстытуту гісторыі, які сапраўды з'яўляўся цэнтрам гістарычнай навукі, бо сабраў найлепшыя кадры краіны, пачалася таксама яшчэ ў 1995-96 гадах, і пакуль не скончылася. Чаго толькі ні пісала афіцыйная прэса, абразліва называючы флагман беларускай гістарыяграфіі "националистическим заповедником", або заяўляючы, што яго дзейнасць "супярэчыць гістарычнай праўдзе, палітыцы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь". Асабліва высільвалася газета "Веды" - перыядычны орган Нацыянальнай акадэміі навук і Міністэрства адукацыі, рэдактарскае крэсла ў якой было аддадзена члену той самай Дзяржаўнай камісіі па падручніках В. Дашкевічу. Найбольш паслядоўна і груба крытыкаваліся акадэмічныя "Нарысы гісторыі Беларусі", у віну якім ставілася тая ж "антыруская накіраванасць і прыніжэнне ролі савецкага перыяду", скажэнне гісторыі наагул. Крытыкі імкнуліся давесці, што гісторыкі з Акадэміі навук прафесійна непрыдатныя, а найбольш вінаваты дырэктар інстытуту акадэмік Міхаіл Касцюк. Публікуючы дылетанцкія, часта антынавуковыя матэрыялы членаў клубу "Гістарычныя веды", у якіх пераважалі эмоцыі і палітычныя штампы, галоўны рэдактар "Ведаў" абяцаў стварыць з іх спецыяльны навучальны дапаможнік, "азнаямленне з якім павінна стаць абавязковым у сярэдніх школах і ВНУ". У кастрычніку 1999 г. на ўрачыстасцях з нагоды 70-годдзя Інстытуту гісторыі прэзідэнт НАН Беларусі Аляксандр Вайтовіч выступіў з жорсткімі палітычнымі абвінавачваннямі ў адрас дырэкцыі Інстытуту, якія даходзілі да абразаў.

Выразным сімвалам арганізаванага наступу на Інстытут гісторыі стала прымацаваная на яго будынку на самым пачатку 2000 г. расійскамоўная мемарыяльная дошка колішняму прэзідэнту Беларускай Акадэміі Паўлу Горыну - акурат той асобе, якой у 1930-х бальшавіцкая ўлада даручала граміць нацдэмаўшчыну і арганізаваць акадэмію "сапраўдную камуністычную, падпарадкаваную інтарэсам сацыялістычнага будаўніцтва".

Крэда "правільнага" асвятлення беларускай гісторыі (а фактычна - хімера ўбогай версіі "западно-руссизма" і панславізму) у 1999 годзе было выкладзена адным з такіх "знаўцаў" у выданні Інстытуту сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: "Белорус... по своей теоретической и практической жизни является русским человеком", а варожы славянам Захад "ведет тотальную информационно-психологическую войну против общерусского мировоззрения нашего народа"... Каментар тут даваць немагчыма, можна толькі ставіць дыягназ.

Генадзь САГАНОВІЧ,
кандыдат гістарычных навук.

ДАВЕДКА:

Генадзь Сагановіч—уражэнец вёскі Турная Івацэвіцкага раёну, гісторык беларускага сярэднявечча.

Генадзь Сагановіч - аўтар кніг "Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі", "Невядомая вайна", якія сталі гістарычнымі бестселерамі. Разам з Уладзімірам Арловым ён аўтар кнігі "Дзесяць вякоў беларускай гісторыі". Напісана ім вялікая колькасць навуковых і публіцыстычных артыкулаў на гістарычную тэматыку.

Акрамя таго, Генадзь Сагановіч - адзін з заснавальнікаў і галоўны рэдактар часопіса "Беларускі гістарычны агляд" (з 1994 года). У 1996 годзе Беларускім ПЭН-цэнтрам узнагароджаны медалем імя Ф. Багушэвіча.

У сваёй кнізе "Невядомая вайна", якая напісана на падставе шматлікіх архіўных, літаратурных, археалагічных дадзеных, гісторык даводзіць, што найкрывавейшай для беларускіх зямель была вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654 - 1667 гадоў. У гэтыя гады расійскімі войскамі было забіта больш за палову (!) насельніцтва нашай зямлі. У выніку, толькі праз два стагоддзі колькасць насельніцтва Беларусі дасягнула даваеннага стану. Цяжка сказаць, калі ж Беларусь канчаткова акрыяла ад тае катастрофы. І ці акрыяла наагул. Вельмі ж доўга давялося пераадольваць рэгрэс - дэмаграфічны, гаспадарчы, культурны, прычынены рускім царом Аляксеем Міхайлавічам - тым самым "добрейшим человеком, славной русской души" (расійскі гісторык В.В.Ключэўскі). Сагановіч менавіта ў тых падзеях бачыць сваімі вытокамі прычыны крызісу, у які на доўгі час трапіла беларуская культура ў цэлым.

У 2005 годзе Генадзь Сагановіч быў звольнены з Інстытута гісторыі "за парушэнне працоўнай дысцыпліны". Многія аналітыкі, калегі-навукоўцы называюць іншую прычыну звальнення: незадаволенасць грамадскай і навуковай пазіцыяй гэтага аднаго з вядучых беларускіх гісторыкаў. Першай падставай для ціску стала паездка ў архівы Кракава: маўляў, Г.Сагановіч "не аформіў паперу для камандзіроўкі". Гэтак праца ў архівах залічылася за прагулы.

Нягледзячы ні на што, сёння Генадзь Сагановіч, як і іншыя яго паплечнікі, плённа працягвае займацца гісторыяй, піша артыкулы ў многія беларускія і замежныя часопісы, а таксама застаецца галоўным рэдактарам часопіса "Беларускі гістарычны агляд". У 2006 годзе пад рэдакцыяй Генадзя Сагановіча была выдадзена кніга "Слуцкі збройны чын 1920 г.", дзе былі выкладзеныя многія дакументы і успаміны пра антыбальшавіцкае паўстанне на Случчыне.

Павел ДАЙЛІД,
Івацэвічы

ПАВЕЛ БАБРОЎСКІ— ГЕНЕРАЛ

У беларускай гісторыі XIX стагоддзе з'яўляецца вельмі адметным. Яно выдзяляецца як перыяд фарміравання беларусаў як нацыі, развіцця самасвядомасці (усведамлення сябе і сваіх продкаў часткай пэўнага народа) і ўласнай літаратурнай мовы, барацьбы нашых продкаў за самавызначэнне і інш.. Нават сама назва *"Беларусь"* у дачыненні да усіх зямель нашай сучаснай дзяржавы замацавалася ў тыя часы. Менавіта на працягу гэтага веку ішлі сур'ёзныя даследаванні навукоўцаў у галіне ўсебаковага вывучэння Беларусі. Цікава, што не апошнюю ролю ў гэтым адыгралі і нашы землякі. Сярод іх заўсёды адзначаюць выдатнага вучонага Міхаіла Баброўскага, лёс якога звязаны з Шарашовам. Аднак у гэтай сувязі трэба абавязкова ўзгадваць і яго пляменніка – Паўла Баброўскага, бліскучага афіцэра і даследчыка, аб якім, на вялікі жаль, нашы суайчыннікі амаль не чулі.

Павел Баброўскі (16 лютага 1832 г. – 1905 г.) нарадзіўся ў маёнтку Вака каля Вільні ў беднай шляхецкай сям'і. Аднак дзяцінства яго прайшло на Пружаншчыне. У выніку цяжкіх матэрыяльных абставін сям'я Баброўскіх пераехала ў вёску Абруб каля Стараволі. Магчыма, не апошнюю ролю ў гэтым адыграў той факт, што непадалёку ў Шарашове з 1833 г. трымаў прыход родны дзядзька Паўла – Міхаіл Баброўскі, якога можна назваць адной з самых яркіх асоб нашай мінуўшчыны (былы прафесар і доктар тэалогіі Віленскага універсітэта, выдатны вучоны-славіст, *"першы скарыназнаўца"*, прыхільнік дэмакратычных ідэй, пачынальнік беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння). Ён аказаўся ў Шарашове пасля закрыцця універсітэта як *"рассадніка шкодных ідэй"*, так як значная частка студэнтаў і выкладчыкаў аказаліся звязаны з антырасійскім паўстаннем 1830 – 1831 г.г..

Бацька Паўла Баброўскага хутка памёр, і хлопец разам з маці засталіся без сродкаў для існавання. Славуты сваяк з Шарашова не мог пакінуць іх у такі складаны момант і ўзяў сям'ю брата пад сваю апеку. Праўда, і яго маёмаснае становішча прымушала чакаць лепшага. Не адзін раз айцу Міхаілу, які быў настаяцелем шарашоўскай Прачысценскай царквы, прыходзілася прадаваць свае карысныя рэчы, нават частку багацейшай бібліятэкі, якую ён збіраў усё жыццё (шляхціцу Уладзіславу Трэмбіцкаму з маёнтка Лінова). Выхаванне вядомага дзядзькі аказала вызначальны ўплыў на маладога пляменніка. Хлопчык часта бываў у Шарашове і там з дапамогай Міхаіла Баброўскага, які толькі замежных моў ведаў сямнаццаць, ён атрымаў выдатную пачатковую адукацыю. Пасля Павел працягваў вучобу ў пружанскім дваранскім вучылішчы, якое паспяхова закончыў. На сямейным савеце было вырашана, што для хлопца з небагатай дваранскай сям'і добра падыдзе вайсковая справа. Такім чынам юнак адправіўся набываць прафесію ў Полацкі кадэцкі корпус (1844 – 1849 г.г.), а ў 1851 г. закончыў Дваранскі корпус (Канстанцінаўскае ваеннае вучылішча). Трэба адзначыць, што выбраны шлях быў для Паўла правільным, кар'ера ваеннага склалася ў яго даволі ўдала. Аднак яго не назавеш *"кабінетным ваенным"*. У час няўдалай для Расіі Крымскай вайны з туркамі і іх саюзнікамі (1853 – 1856 г.г.) малады Баброўскі ваяваў на фронце і быў адзначаны некалькімі баявымі ўзнагародамі.

Пасля вайны баявы афіцэр вырашыў удасканаліць сваю адукацыю – у 1857 г. ён закончыў Мікалаеўскую акадэмію Генеральнага штаба ў Санкт-Пецярбургу. Здольныя і адукаваная ваенныя заўсёды патрэбны дзяржаве. Яго верная служба і дасканалыя веды былі ацэнены армейскімі вярхамі. Баброўскаму былі прапанаваны розныя пасады пры Генеральным штабе расійскай арміі. Але класічным штабным работнікам ён таксама не стаў.

Па загаду расійскага ўрада Павел Баброўскі з 1859 г. ўзначальваў групу афіцэраў Генеральнага штаба, якія правялі падрабязнае апісанне і вывучэнне Гродзенскай губерні, тым больш, што сам ён добра ведаў гэтыя мясціны. Такія работы праводзіліся па ўсіх беларускіх губернях і мелі на мэце падрабязнае апісанне далучаных у канцы XVIII ст. да Расіі зямель для дасканалага валодання інфармацыяй аб іх, так як яны знаходзіліся на межах расійскай дзяржавы і мелі, ў першую чаргу, стратэгічнае значэнне. Аднак у скурпулёзна сабраных ваеннымі матэрыялах знаходзіліся таксама багатыя гісторыка-культурныя, этнаграфічныя, эканамічныя і іншыя звесткі. Гэтыя працы па сённяшні дзень з'яўляюцца важнымі крыніцамі па гісторыі Беларусі XIX ст. і ранейшых часоў.

Пасля завяршэння работы групы Баброўскага ў 1863 г. былі выдадзены *"Материалы для географии и статистики Российской империи, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния"* і дадаткі ў двух тамах

У гэтай працы было шмат цікавых звестак. Дзякуючы даследчыку, да нас дайшлі звесткі аб нашым горадзе і раёне XIX стагоддзя. Так, па ўспамінах нашага земляка, Пружаны ў той час выглядалі не вельмі прывабна. Вось як ён апісвае наш горад: *"…На галоўнай вуліцы (ад Кобрынскага ўезду да палацу Швыкоўскага) знаходзіцца камены дом "присутственных мест", лаўкі, рынак, 2 царквы, турма и лепшыя "заезжие дома". Астатнія вуліцы кепска пабудаваны і ўтрымліваюцца ў гразі ... На працягу 10 год (1848 – 1857) у гарадскую казну паступіла 11 тысяч 460 рублёў 84 капейкі. Такіх нязначных прыбыткаў не прадстаўляе ні адзін павятовы горад у Гродзенской губерні..."*. Прычынай малой прыбытковасці горада з'яўлялася тое, што ён працаваў у асноўным на ўнутраныя патрэбы рынку, ніякія шляхі зносін, акрамя паштовага тракту, не праходзіла праз Пружаны.

Аб неразвітасці сур'ёзных рынкавых адносін у нашым рэгіёне сведчаць і наступныя факты з гэтага дакумента: *"Багата вялікімі пашамі прастора Палесся і лясныя месцы Белавежскай … пушчы…, якія населены больш заможнымі, чым беднымі сялянамі… Багацце тутэйшых сялян заключаецца не столькі ў запасе грошаў, колькі ў запасе хлеба і сена…"*. Цікава, што тут, па сведчанні даследчыка, крыніцай прыбытку былі таксама кантрабанда, вырошчванне хмелю для броваряў, высечкі і продаж *"казённага"* лесу.

Сам Павел Баброўскі, як і яго славуты дзядзька Міхаіл, з дзяцінства захапляўся вывучэннем гісторыі і культуры роднай зямлі, беларускай мовай, якую ён добра ведаў, гісторыяй уніяцкай царквы (сям'я

Дзядзька Паўла Баброўскага— Міхал, святар з Шарашова

І ДАСЛЕДЧЫК З ПРУЖАНШЧЫНЫ

Баброўскіх толькі ў 1839 г. пасля забароны уніяцтва перайшла ў праваслаўе), а таксама летапісамі. Таму праца па збіранні матэрыялаў прыносіла яму вялікае задавальненне і дазволіла выступіць у якасці сур'ёзнага даследчыка беларускай даўніны. Аўтарытэт П.Баброўскага быў даволі высокі, асабліва ў кіруючых колах.

Этнаграфічныя даследаванні Паўла Баброўскага заслугоўваюць асаблівай увагі. Ён адным з першых сур'ёзна ўзняў пытанне аб моўнай і этнічнай прыналежнасці насельніцва Беларусі. У гэтай сувязі ён актыўна палемізаваў з П.Эркертам, які на першае месца ў вызначэнні гэтых крытэрыяў для мясцовых жыхароў ставіў рэлігійны фактар: праваслаўных беларусаў ён далучаў да *"рускіх"*, а каталікоў – да *"палякаў"*. Хацелася б прывесці некаторыя вытрымкі з матэрыялаў нашага земляка. Баброўскі сцвяржаў, адкідаючы нацыянальны падзел беларусаў паводле веравызнання: *"...не дастаткова ведаць, хто ходзіць у касцёл і хто ў царкву, трэба яшчэ ведаць, хто гаворыць па беларуску і хто па польску, каб правільна размежаваць суседнія народнасці"*. Калі ж яму супрацьпастаўлялі факт, што тутэйшыя людзі не называюць сябе беларусамі, ён адказваў: *"Якая нам справа да таго, што беларусы не называюць сябе беларусамі, а простымі ... але яны гавораць па беларуску ...Яны, не ведаючы таго, што яны беларусы – захавалі ў штодзённай мове, і ў песнях, у прыслоўях, свае пэўныя нацыянальныя, лагічныя формы, свой дух, свой пэўны характар – свае справы, свае звычаі і т.п."*. Наступная заява нашага суайчынніка з'яўляецца актуальнай і сучаснай нават зараз: *"Каб пераканацца да якога племені належаць жыхары пэўнай краіны, самым дакладным і практычным спосабам з'яўляецца найперш мова, а за ёй і іншыя жыццёвыя з'явы, таму што мова – гэта як радавы герб, пакінуты чалавеку яго продкамі, яго карэнным племенем, гэта люстэрка, у якім найвыразней адбіваецца маральны характар і нават уся гісторыя народу, мова жыве разам з народам, разам з ім развіваецца і памірае ..."*. Ён таксама лічыў, што *"...вельмі карысным сродкам было б навучанне на роднай мове"*, каб прыцягнуць мясцовае беларускае насельніцтва на бок расійскіх улад.

Аднак, не трэба думаць, што Баброўскі быў *"рэвалюцыянерам"* у сваіх поглядах. Ён не адыходзіў ад афіцыйнай ідэалогіі аб беларусах, як адгалінаванні рускіх, так як сам з'яўляўся расійскім чыноўнікам, хаця сваімі даследаваннямі паказаў зусім адваротнае. Насельніцтва Гродзенскай губерні П.Баброўскі падзяліў на *"Рускіх"* (*"Чорнарусаў, па мове Беларусаў і Маларусаў, альбо Палешукоў ці Пінчукоў і Бужан"*, а таксама этнічныя групы яцвягаў і *"падлясян"*) і *"Палякаў-Мазураў"*. Першыя, па яго дадзеных складалі ў Гродзенскай губерні 77,58 %, а другія – 10,15 %. Калі

Крыж на магіле Міхала Баброўскага ў Шарашове

абапірацца на яго дадзеныя, то большасць Пружанскага і Слонімскага (уваходзіла Ружаншчына) паветаў складалі *"Рускія"*, якія ў паўночнай частцы Пружанскага павета размаўлялі *"асобнай гаворкай, блізкай да беларускай* (так званай, *"чорнарускай"*), *... ў паўднёвай частцы Пружанскага, ... часткова Слонімскага паветаў – блізкай да Маларасійскай ці Валынскай"*. Цікава, што *"чорнарускай"* мову нашых зямель называў і Міхаіл Баброўскі. Так што ўрокі вялікага дзядзькі не прайшлі дарэмна, а справа яго была працягнута.

У сталым узросце наш суайчыннік не застаўся без справы. Цяпер яго жыццё было больш звязана з педагагічнай дзейнасцю. На працягу 1875 – 1897 г.г. Павел Баброўскі з'яўляўся начальнікам, а таксама выкладчыкам Ваенна-юрыдычнай акадэміі Расійскай імперыі. У гэты час ён ужо меў званне генерала ад інфантэрыі. Павел Восіпавіч працягваў даследаванне гісторыі летапісаў ("Лёс Супрасльскага летапісу..." (1887 г.), "Яшчэ нататка пра Супрасльскі рукапіс" (1888 г.)), уніяцкай царквы ("Руская грэка-уніяцкая царква ў цараванне імператара Аляксандра I" (1890 г.)), жыцця і навуковай дзейнасці свайго дзядзькі Міхаіла Баброўскага. Ён з'яўляўся аўтарам шэрагу краязнаўчых артыкулаў пра Гродна, Слонім, Зэльву і інш. На сённяшні дзень архіў П.Баброўскага знаходзіцца ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу.

Працы нашага земляка з'яўляюцца каштоўным скарбам для вывучэння і разумення мінулага нашай Бацькаўшчыны. Спадчына Паўла Баброўскага чакае дасканалага даследавання. Тым больш, што яго думкі і выказванні актуальныя і па сённяшні дзень.

Наталля ПРАКАПОВІЧ,
г. Пружаны,
гісторык, краязнаўца

АСНОЎНЫЯ ПРАЦЫ ПАЎЛА БАБРОЎСКАГА:

Вейде Адам Адамович, один из главных сотрудников Петра Великого и его устав 1698 года. (Историко-юридическое исследование). Казань, 1887

Военное право в России при Петре Великом. СПб., 1887

Военные законы в рукописях и первопечатных изданиях. СПб., 1887

Воспоминания офицера о военных действиях на Дунае 1853 и 1854 гг. СПб., 1887

Гродненская губерния. Ч. 1—2 (в 4-х книгах). СПб., 1863 (сокращённое издание в одном томе: СПб., 1864)

Завоевание Ингрии Петром Великим. СПб., 1891

Зачатки реформ в военно-уголовном законодательстве в России. СПб., 1882

Значение Кавказской резервной гренадёрской бригады 1816—1856 гг. (О совокупных действиях на поле сражения и в бою). СПб., 1895

История Лейб-гвардии Преображенского полка. Т. 1—2 (в 4-х книгах). СПб., 1900—1904

История Лейб-гвардии Уланского Её Величества полка. Т. 1—2 (в 4-х книгах). СПб., 1903

История 13-го Лейб-гренадёрского Эриванского Его Величества полка за 250 лет. М. Ф. — А III. 1642—1892. Ч. 1—5 (в 7 книгах). СПб., 1892—1898

К биографии Антония Юрьевича Сосновского. Переписка в 1826, 1827 и 1828 гг. Вильна, 1891

К истории военно-учебной реформы Императора Александра II // «Русская старина», 1887 г.

Кубанский егерский корпус, 1786—1796 гг. СПб., 1893

Михаил Кириллович Бобровский (1785—1848), учёный-ориенталист. Историко-биографический очерк. СПб., 1889

Переход России к регулярной армии. СПб., 1885

Постоянные войска и состояние военного права в России в XVII столетии. М., 1882

Преступления против чести по русским законам до начала XVIII века. СПб., 1889

Происхождение артикула воинского и изображение процесов Петра Великого по уставу воинскому 1716 г. СПб., 1881

Пятьдесят лет специальной школы для образования военных законоведов России. СПб., 1883

Развитие способов и средств для образования юристов военного и морского ведомств в России. Т. 1—2 (в 5-ти вып.). СПб., 1879—1898

Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александр I. Историческое исследование по архивным документам. СПб., 1890

Старошведское военное право. М., 1881

Уклонение от военной службы. По законам древнеримским, французским, германским, шведским а также и русским с XVII века. СПб., 1886

Юнкерские училища. Т. 1—3 (в 5-ти книгах). СПб., 1872—1876

Дадзеная бібліяграфія прыводзіцца паводле інтэрнэт-старонкі http://ru.wikipedia.org/wiki/Бобровский_Павел

СЫН БЫЦЕНЬСКАГА СВЯТАРА

Малавядомая старонка жыцця У. Ігнатоўскага

Вельмі значнай у гісторыі Беларусі з'яўляецца постаць Усевалада Макаравіча Ігнатоўскага – дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Беларусі, вучонага-гісторыка, першага Прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі. Але мала хто ведае, што колькі год сям'я Макара Іванавіча Ігнатоўскага, бацькі акадэміка, жыла ў мястэчку Быцень сённяшняга Івацэвіцкага раёна. Ды ўсё па парадку.

Нарадзіўся Усевалад Ігнатоўскі 19 красавіка 1881 г. у в. Токары Камянецкага раёна. Бацька яго, Макар Іванавіч, быў настаўнікам мясцовага народнага вучылішча, а пасля, стаў служыцелем царквы, закончыўшы Кіеўскую духоўную семінарыю, і сына свайго ён хацеў бачыць святаром, бо адправіў вучыцца Усевалада спачатку ў віленскае духоўнае вучылішча, а пасля ў семінарыю. Каб пазбегчы звальнення з семінарыі за ўдзел у распаўсюджванні рэвалюцыйных пракламацый, Усевалад Ігнатоўскі перавёўся ў Магілёўскую семінарыю, якую скончыў у 1902 г. Пасля неаднойчы яго недобразычліўцы крычалі аб тым, што навуковец Ігнатоўскі зусім не савецкі, бо, бачыце, бацька ў яго быў поп і ён сам выхаванец духоўнай семінарыі, хоць царкоўнай асобай У. М. Ігнатоўскі ніколі не быў.

Восенню 1902г. Усевалад Ігнатоўскі паступіў у Пецярбургскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. Пасля заканчэння першага курса на летнія канікулы ён паехаў у мястэчка Быцень, куды бацька перавёся на вакантнае месца свяшчэнніка ў мясцовай Успенскай царкве.

Усё тут яго цікавіла і захапляла: адзнакі глыбокай старасветчыны і быт мястэчка, маляўнічая прырода і мясцовы вакольны люд. Бацька яго, Макар Іванавіч, акрамя непасрэдных святарскіх абавязкаў, выкладаў Закон Божы у Быценскім народным вучылішчы. Дарэчы, вучняў у 1902-1903 навучальны год было шмат: 200 хлопчыкаў, але ніводнай дзяўчынкі.

З наступнага навучальнага года працы Макару Іванавічу прыбавілася, акрамя Быцені, Закону Божаму ён вучыць дзетак вёскі Доўгая. Праўда, школка была невялікая: яе наведвалі ўсяго 32 вучні.

Але вернемся да Усевалада Ігнатоўскага. Гады якія выпалі яму на час навучання ў Пецярбургу, былі неспакойныя. Студэнцкае жыццё кіпела: праходзілі сходкі, дэманстрацыі, якраз ствараліся палітычныя партыі. Юнак з галавой акунуўся ў бурлівае жыццё, зрбіў свой першы палітычны выбар, уступіўшы ў партыю эсераў. За ўдзел у антыдзяржаўныхдэманстрацыях, як палітычна ненадзейнага яго выслалі да бацькоў у Быцень – і хоць у 1906 г. Яму ўдалося аднавіць вучобу ў Пецярбургскім універсітэце, ужо на наступны год яго выслалі на пасяленне ў Аланецкі край. Пасля адбыцця пасялення паступіў у 1909 г. у Юр'еўскі (Тартускі) ўніверсітэт, які закончыў у 1911г. Ужо ў тыя гады яго ўсё больш цікавіла гістарычнае мінулае беларускага народа.

У няпросты час першай сусветнай вайны яго палітычныя погляды паступова збліжаліся з платформай беларускага нацыянальнага руху ў яго рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні. У Яраслаўлі, куды перабраўся Мінскі настаўніцкі інстытут (Усевалад Макаравіч быў яго выкладчыкам, а пасля дырэктарам), У.М. Ігнатоўскі ўключаецца ў палітычныя варункі той пары: прымае ўдзел у выступленнях супраць царызму, пазней ва ўсталяванні ў горадзе савецкай улады.

У 1919г. У.Ігнатоўскі ствараў у Мінску Беларускую камуністычную арганізацыю, а яшчэ праз год уступіў у РКП(б).

Вясной 1921г. яго прызначаюць народным камісарам асветы БССР. Ён па праву лічыцца адным з заснавальнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

У. М. Ігнатоўскі меў непасрэднае дачыненне да арганізацыі Дзяржаўнай і універсітэцкай бібліятэк, Дзяржаўнага музея. Цэнтральнага архіва выдавецтва "Савецкая Беларусь".

Вялікі ўклад унёс У.М.Ігнатоўскі і ў станаўленне гістарычнай навукі ў краіне. Ім напісаны шэраг выдатных навуковых прац па гісторы Беларусі, сярод якіх "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі"(1919г), "Гісторыя Беларусі ў XIX і па пачатку XX ст"(1926г.), "1863 год на Беларусі" (1930г.) і інш.

У 1929 г. ён становіцца першым прэзідэнтам Беларускай Акадэміі навук. Ад гэтага года і да пачатку 1931г. ён пачаў падвяргацца жорсткім абвінавачванням з боку партыйных органаў у нацыяналізме.

У студзені 1931г. У. Ігнатоўскага выключылі з партыі, неаднаразова выклікалі на допыты ў АДПУ. Не маючы магчымасці супрацьстаяць і даказаць ілжывасць надуманых абвінавачанняў, У.М. Ігнатоўскі застрэліўся 4 лютага 1931г.

Трагічна склаўся лёс сям'і У.М. Ігнатоўскага. Старэйшы яго сын Міхась стаў гісторыкам, але не змог знайсці працу ў Мінску і ў 1934г. паехаў у Сібір. Там ён працаваў электрыкам, інжынерам, настаўнікам, і толькі на пачатку 60-х гадоў вярнуўся на Радзіму.

У кастрычніку 1936г. арыштавалі сярэдняга і малодшага яго сыноў – Юрася і Валянціна. Яны абвінавачваліся ў тым, што быццам бы арганізавалі тэрарыстычную групу, бо "затаілі злобу супраць Савецкай улады і паставілі сваёй задачай помсціць за смерць бацькі. У кастрычніку 1937г. Юрась і Валянцін Ігнатоўскія расстраляны.

Жонку У.М. Ігнатоўскага – Марыю Севасцьянаўну – арыштавалі ў жніўні 1937г. і як жонку "ворага народа" асудзілі на 8 год турмы. Пакаранне адбывала ў вядомым Карлагу. Пасля вызвалення ў 1943г. паехала да адзінага жывога сына Міхася ў Камянецкую вобласць, дзе і памерла ў 1951г.

Амаль 60 год імя славутага вучонага было выкраслена з гісторыі Беларусі: і толькі зараз мы маем магчымасць звярнуцца да яго навуковай спадчыны, даведацца аб фактах яго біяграфіі. Як бачым, жыццё Усевалада Макаравіча Ігнатоўскага звязана і з нашым краем, з мястэчкам Быцень.

Аляксандр ЗАЙКА, Заполле,
Івацэвіцкі раён

«...ПАТРЭБНА ПАВАЖАЦЬ І ЛЮБІЦЬ КОЖНЫ НАРОД, АЛЕ ПАСЛЯ БЕЛАРУСІ»

Да 125-ых угодкаў з дня нараджэння Аляксандра Цвікевіча

Імя гэтага чалавека пачало вяртацца з небыцця толькі ў 1990-я гады, калі айчынная мінуўшчына паступова пазбаўлялася ад фальсіфікацыі і ідэалагізацыі. На жаль, укладальнікі выдання „Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Брэста. У 2 кн.", кн. 1. (Мінск 1997) не ўзгадалі гэтага славутага сына Берасцейшыны. А здзейсненае ім набыло асаблівую актуальнасць менавіта цяпер, калі няпроста ідзе станаўленне беларускай дзяржаўнасці. Хто ж ён, Аляксандр Цвікевіч?

Аляксандр Іванавіч Цвікевіч нарадзіўся 22 чэрвеня 1883 г. у Брэст-Літоўску ў сям'і фельчара чыгуначнай бальніцы. Добрая адукацыя, атрыманая ў прыватных настаўнікаў і ў мужчынскай гімназіі (цяпер яе будынак — адзін з карпусоў Брэсцкага дзяржуніверсітэта), дазволіла юнаку паступіць на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1912 г. Да 1914 г. працаваў прысяжным павераным у Пружанах і Брэст-Літоўску. Паводле водгукаў калег і начальства, малады юрыст меў усе падставы для неблагой службовай кар'еры. Аднак далейшыя падзеі карэнным чынам змянілі лёс Цвікевіча. Першая сусветная вайна і набліжэнне ў 1915 г. лініі фронту да беларускіх зямель прымусілі накіравацца ў эвакуацыю на ўсход. Як адзначае даследчык Арсень Ліс, менавіта народнае гора яго землякоў-бежанцаў, асуджаных на тулянне, галечу, голад, далучыла Аляксандра Цвікевіча да грамадскага, а пазней і да нацыянальна-вызваленчага руху.

Апынуўшыся ў Туле, прымаў актыўны ўдзел у працы камітэта дапамогі ахвярам вайны. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. абудзіла нацыянальную свядомасць прадстаўнікоў беларускага народа. Група інтэлігенцыі на мітынгу ў Маскоўскім універсітэце 9 мая 1917 г. заснавала Беларускую народную грамаду (БНГ). Сярод кіраўнікоў гэтай арганізацыі быў і Аляксандр Цвікевіч. Яе касцяк складалі бежанцы-беларусы. Мэтай БНГ з'яўлялася аўтаномія Беларусі ў складзе федэратыўнай рэспублікі Расіі.

У снежні 1917 г. ён прымаў удзел у рабоце І Усебеларускага з'езда ў Мінску. Дэлегаты з удзячнасцю ўспрынялі яго прывітальнае слова ад бежанцаў-беларусаў. „Бежанцы пралілі мора слёз, калі яны ўцякалі са сваіх родных гнёздаў у 1915 годзе. Па шляху свайго руху з'явілася маса могілак. Дзеці адлучаны ад маці, жонкі ад мужоў. Ні ў кім так не сказваецца любоў да роднага краю, як у бежанцаў. Любоў да роднай зямлі і да родных могілак цягне іх вярнуцца на свае месцы".

У парадак дня з'езда было ўключана пытанне аб бежанцах, даклад па якім павінен рабіць Аляксандр Цвікевіч. Яго выступленне аб становішчы гаспадаркі краіны ўтрымлівала шэраг прапаноў па вырашэнні праблем бежанцаў. Бальшавікі разагналі з'езд, але гэта толькі паскорыла працэс станаўлення дзяржаўнасці Беларусі. У сваёй брашуры „Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики" Аляксандр Цвікевіч адзначаў, што „Усебеларускі з'езд першую частку сваёй задачы ажыццявіў. У прысутнасці сатрапаў з „Савета", пад пагрозай штыкоў і расстрэлу з браневіка, ён аднагалосна (...) вынес рэзалюцыю «аб зацвярджэнні на беларускай зямлі рэспубліканскага ладу», аб непадзельнасці Беларусі і аб замацаванні за яе грамадзянамі асноўных правоў, заваяваных рэвалюцыяй".

У студзені 1918 г. Выканкам І Усебеларускага з'езда накіраваў Аляксандра Цвікевіча ў Брэст-Літоўск для ўдзелу ў мірных перагаворах. Разам з Сымонам Рак-Міхайлоўскім ён пешшу перайшоў лінію фронту ля Баранавіч. „Нямецкая вайсковая часць, што там стаяла, прыняла іх, як трэба, падрыхтаваўшы ўжо і вагон для ад'езду ў Берасце, як раптам пасля тэлеграфнага запытання, атрымала паведамленне, што Троцкі (...) ніякай Беларусі не прызнае". Пасля мноства выпрабаванняў беларускім дэлегатам удалося прысутнічаць на канферэнцыі, але толькі ў якасці дарадцаў дэлегацыі Украінскай Народнай Рэспублікі.

Заклапочаныя праблемамі ў Брэст-Літоўску, Цвікевіч і Рак-Міхайлоўскі не ведалі аб тых гістарычных падзеях, што адбываліся ў Мінску. Пра гэта сведчыць іх ліст, што датуецца 28 лютага 1918г.



„Дарагія браты! Надта трудна была наша праца ў палітычным кірунку ад таго, што нам было невядома аб палажэнні беларускага пытання ў Вас, за кардонам. Толькі сёння, прачытаўшы Вашу газету „Гоман", мы даведаліся, што ў Вас адбылася Канферэнцыя, на якой было прызнана патрэбным дабівацца Беларускай незалежнай Рэспублікі. Звесткі гэтыя надта глухія, таму просім Вас паведаміць нам дэтальна, які змест Вы ўкладаеце ў паняцце незалежнасці і як Вы мысліце сабе шлях да гэтага. Справа ў тым, што мы ясна ўсведамляем са свайго боку, што (...) ні палітычна, ні эканамічна беларускі народ жыць незалежна не можа: ён слабы сіламі культурнымі і бедны эканамічна (...). Мы сваім прыездам ужо трохі перамітусілі карты і толькі шкада, што трохі спазніліся, але наша мэта — незалежнасць Беларусі ў этнаграфічных яе граніцах — ужо зрабіла ўражанне на немцаў...".

Пасля Брэсцкага міру Аляксандр Цвікевіч быў накіраваны ў Кіеў у складзе спецыяльнай дыпламатычнай місіі для вядзення з зацікаўленымі бакамі перамоў аб пераглядзе яго і прызнанні незалежнасці БНР. З дапамогай Цвікевіча ў Кіеве быў наладжаны выпуск газеты „Белорусское эхо", арганізавана Беларуская гандлёвая палата. А летам 1918 года ён узначаліў надзвычайную місію ўрада БНР у Маскве.

Летам 1918 г. Аляксандр Цвікевіч таксама трапіў у кіруючыя органы Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў, для якой былі характэрны цэнтрызм у дзейнасці і жаданне змагання як за нацыянальныя, так і сацыяльныя правы. Мэтай партыі з'яўлялася дэмакратычная рэспубліка ў супольнасці сусветнай федэрацыі.

Вясной 1919 г. Аляксандр Цвікевіч быў накіраваны ў Берлін. Урадавая дэлегацыя БНР імкнулася там вырашыць фінансавае пытанне — атрымаць па акрэдытыве ўкраінскую пазыку. Пасля адмовы германскіх улад выдаць грошы Аляксандр Цвікевіч ездзіў у Вену, каб атрымаць частку з іх у Аўстрыйскім банку. Трохмесячнае знаходжанне ў Берліне суправаджалася актыўнай інфармацыйна-папулярызатарскай дзейнасцю — у час сустрэч з нямецкімі палітыкамі, журналістамі, у ходзе кантактаў з дзяржаўнымі і прыватнымі ўстановамі Германіі. Дзеля іх азнаямлення з беларускім пытаннем пад аўтарствам міністра юстыцыі ўрада БНР Цвікевіча ў Берліне ў 1919 г. была выдадзена брашура Беларусь: палітычны нарыс. У гэтай працы яскрава прагледжваюцца незалежніцкія погляды аўтара. Наконт падзелу беларускіх зямель быў дадзены адназначны адказ — народ не згодзіцца. Зроблена спроба аналізу і прагнозу характару міжнацыянальных адносін на Беларусі. „Шматвекавое сужыццё беларускага народа з рознымі нацыянальнасцямі, якія жывуць на яго тэрыторыі, даюць падставу думаць, што яўрэй, паляк, вялікарос, украінец, літовец і г.д. — усе яны будуць адчуваць сябе ў вольнай Беларусі свабодна, як на сваёй другой радзіме". Гэтая думка грунтавалася на добрым веданні айчыннай гісторыі. Менавіта народ, які „паспытаў на сабе ўвесь цяжар нацыянальнага прыгнёту, пазбаўлены шавінізму і агрэсіўных памкненняў", дасць „кожнаму чалавеку на сваёй зямлі права на яго культуру і жыццё згодна асабістым жаданням". Такую аснову Аляксандр Цвікевіч бачыў у нацыянальным характары беларусаў, галоўнай рысай якога выдзяляў непрыняцце гвалту. „Можна прызнаць, што гэта слабасць беларусаў у сучасным, але сіла і гонар яго ў будучым". Наогул, кніга прасякнута верай у патэнцыяльныя сілы народа, яго лепшую будучыню.

Такі ж аптымістычны накірунак мае і яго артыкул Усе дарогі вядуць у Беларусь, што быў апублікаваны пад псеўданімам Аляксандр Незалежны ў адной з віленскіх беларускіх газет у кастрычніку 1919 г. Асноўны аргумент у абарону беларускай дзяржаўнасці наступны: народ, які меў некалькі стагоддзяў сваю дзяржаўнасць, культуру, літаратуру, свае яркія этнаграфічныя адметнасці, мову, мае ўсе правы на дзяржаўную незалежнасць. (працяг на стар. 12)

«...ПАТРЭБНА ПАВАЖАЦЬ І ЛЮБІЦЬ

Да 125-ых угодкаў з дня

Асабліва небяспечнымі для Беларусі былі ў той час планы кіраўнікоў Польскай дзяржавы, якія імкнуліся пераўтварыць яе землі ў „крэсы ўсходнія". Аляксандр Цвікевіч з гэтай нагоды напісаў кнігу "Адраджэнне Беларусі і Польшчы", якая была выдадзена ў 1921 г. Дэталёвы аналіз розных гістарычных фактараў у адносінах Польшчы да Беларусі даў магчымасць аўтару зрабіць выснову, што галоўнымі з'яўляліся не столькі палітычныя, колькі эканамічныя інтарэсы польскіх памешчыкаў.

У новым урадзе БНР Вацлава Ластоўскага, які вымушаны быў размясціцца ў Коўне (сучасны Каўнас), Аляксандр Цвікевіч займаў у 1921-1923 гг. адказную пасаду — міністра замежных спраў. Па-ранейшаму працягвалася змаганне за прызнанне права Беларусі на сваё месца ў Еўропе. Падзел беларускіх зямель пасля Рыжскага дагавору 1921 г. прымусіў розныя палітычныя партыі пераадолець супярэчнасці і кансалідавацца. Гэта адбылося на Першай Усебеларускай канферэнцыі ў канцы верасня 1921 г. у Празе. Старшынёй згаданай нарады з'яўляўся Аляксандр Цвікевіч. У яго рэдакцыі была прынята рэзалюцыя па віленскім пытанні. Асаблівае абурэнне выклікалі ў яго выступленні паланафільскіх дзеячаў. Вось урывак з адной з такіх прамоў (паводле газеты „Воля России" ад 1 кастрычніка 1921 г.): „Не арыентацыя, а воля народная, не эвалюцыя, а ўсенародная рэвалюцыя. І не будзем чакаць ласкі пана Варшаўскага і камуніста Маскоўскага. Нават у змрочныя часы, калі па беларускай ніве прайшоў першы плуг нацыянальнага руху, арыентацыі не было. І цяпер яе не будзе. Мы аб'яднаемся вакол аднаго лозунга: свабодная і незалежная Беларусь. А Вы, пан Аляксюк, замест таго, каб з трыумфам праехацца ў аўтамабілі пад аховай штыкоў Балаховіча ад Пінска да Мазыра, прайшліся пешшу, то пабачылі б увесь жах польскага прыгнёту і дазналіся ісцінныя патрэбы беларускага народа".

Вынікамі працы канферэнцыі Цвікевіч падзяліўся ў інтэрв'ю газеце „Час" (надрукавана ў нумары ад 5 кастрычніка 1921 г.): „Беларусь ляжыць на дарозе паміж Варшавай і Масквой — і не дзіўна, што пры кожным польска-рускім сутыкненні вынікае беларуская справа, таму што фактычна на яе тэрыторыі вядзецца бойка. Гэта наша гістарычнае няшчасце". „Лозунгам яднання ёсць незалежнасць Беларусі і поўнае адмежаванне ад усялякіх арыентацый на суседзяў", — так ён вызначыў асноўны пункт сутыкнення пазіцый розных палітычных сіл. У згаданым інтэрв'ю ён падкрэсліваў, што жорсткі акупацыйны рэжым бальшавікоў на ўсходзе беларускіх зямель і польскі шавінізм на захадзе прымусілі асудзіць іх і прыняць рашэнне аб арганізацыі паўстанняў.

Далейшы ход падзей паказаў, што пэўны час яму і яго паплечнікам па палітычнай эміграцыі ўсё-такі даводзілася арыентавацца на Літву, якая таксама прытрымлівалася антыпольскіх настрояў. Аднак працягвалася дыпламатычная барацьба за прызнанне ўрада БНР еўрапейскай грамадскасцю, інфармаваліся колы палітыкаў аб культурна-нацыянальным стане беларусаў. Вацлаў Ластоўскі і Аляксандр Цвікевіч рабілі спробу ўключэння беларускага пытання ў парадак дня Генуэзскай канферэнцыі 1922 г. У пададзенай на імя старшыні канферэнцыі ноце яны прызнавалі Вільню сталіцай Літвы і пагаджаліся з уключэннем Віленшчыны і часткі Гродзеншчыны ў склад Літоўскай рэспублікі. Гэта прывяло да ўрадавага крызісу БНР.

У перыяд знаходжання ў Коўне праявіўся з поўнай сілай яго талент выдатнага публіцыста. Артыкулы, змешчаныя ў часопісе „Беларускі сцяг" і іншых выданнях, не страцілі сваёй злабадзённасці і зараз. Часцей падпісваўся крыптонімам А. Ц. ці псеўданімам Алесь Галынец. Вельмі цікавыя выказаны ім у эсэ "Да пытання аб незалежнасці". Аўтар сцвярджае, што ўстанаўленне нацыянальнага суверэнітэту „ёсць масавы псіхалагічны працэс", а не проста фармальна юрыдычны акт. „Кожны народ, які хоча знайсці і акрэсліць самога сябе, які хоча стаць у роўню са сваімі суседзямі, павінен перажыць гэты працэс". Гэта адбываецца, як падкрэсліваў Цвікевіч, з цягам часу, „таксама, як адчуваецца фізічная даспеласць кожнага арганізму".

Адданасць свайму народу прагледжваецца і ў эсэ "Незалежнасць" — як праграма сённяшняга дня. Дадзеная праца таксама прасякнута жаданнем даць тэарэтычнае абгрунтаванне імкнення беларусаў да дзяржаўнай самастойнасці. Разважанні аўтара сведчаць аб яго высокім інтэлектуальным узроўні. Ён выступае як аптыміст, бо лічыць, „пакуль у душы народнай гарыць агонь імкнення да яе — датуль барацьба будзе трываць".

Не меншую інтэлектуальную асалоду пры чытанні выклікае і наступная праца Цвікевіча — "Вялікае апрашчэнне ці вялікае ўдасканаленьне?". Цвікевіч спрабуе даць адказы на многія пытанні, што хвалявалі тагачасную свядомую і адукаваную частку разарванага беларускага грамадства. На пытанне: „чаму трэба ратаваць народы (у тым ліку беларусаў) ад этнічнай смерці, знікнення?" прывядзем у якасці адказаў толькі некалькі яго выказванняў: „рознаадметнасць і навізна найбольш цікавяць нас у творчасці народаў", „мова — душа народу і найкаштоўнейшы скарб усяго чалавецтва", „мы павінны берагчы і ўзбагачаць свае духоўныя скарбы", „можна, а нават патрэбна, паважаць і любіць кожны народ, але пасля Беларусі" і іншыя. Увесь змест гэтай работы звернуты да інтэлігенцыі. „Інтэлігенты павінны стаць сапраўднымі сынамі беларускага народу!" — менавіта гэты лозунг-настаўленне адлюстроўвае ідэйную накіраванасць публікацыі. Ва ўяўленні аўтара шлях да гэтага ганаровага і адначасова адказнага звання — сапраўдны сын народа — нялёгкі і цярністы. Найперш патрэбна было адчуць, якімі праблемамі жыве народ. „Вярнуўшыся да народу, інтэлігенцыя не толькі апрасціцца, але духоўна ўдасканаліцца". Паводле Цвікевіча, назвацца сынам Беларусі — значыць не дарма прыйсці да нацыянальнай справы. Ён ахрысціў гэтыя пуцявіны не інакш, як беларуская Галгофа. Якраз яна прынясе інтэлігенту „мільён цярпенняў", але разам з гэтым „родзіць з яго Чалавека новага жыцця". Думкі, разважанні, выкладзеныя ў гэтым своеасаблівым катэхізісе беларускай інтэлігенцыі, даволі актуальныя і цяпер, калі назіраецца тэндэнцыя да згортвання нацыянальна-культурнага адраджэння.

Як ужо адзначалася, у выніку ўрадавага крызісу БНР беларуская палітычная эміграцыя аказалася расколатай. Адносіны паміж ранейшымі паплечнікамі па нацыянальна-вызваленчай барацьбе значна пагоршыліся. Аляксандр Цвікевіч рэзка выступаў супраць Вацлава Ластоўскага, Клаўдзія Дуж-Душэўскага. У прыватнасці, ён не прызнаваў створаны ў Парыжы Камітэт паняволеных Польшчай нацый, у склад якога ўваходзіў былы кіраўнік урада БНР Вацлаў Ластоўскі. А гэты камітэт выступаў супраць нацыянальнага і сацыяльнага ўціску заходнебеларускага насельніцтва з

боку польскіх улад.

23 жніўня 1923 г. на сходзе беларускіх грамадскіх і палітычных дзеячаў у Коўне была негатыўна ацэнена дзейнасць В. Ластоўскага і К. Дуж-Душэўскага, сфарміраваны новы ўрад БНР на чале з Цвікевічам. Антыбеларуская палітыка літоўскага ўрада прывяла да пераезду структур БНР у Прагу. Сярод прадстаўнікоў беларускай палітычнай эміграцыі былі і заўзятыя праціўнікі прызначэння Цвікевіча, што заставаўся ў Коўне, на пасаду кіраўніка ўрада БНР. Палітычныя апаненты кідалі ў яго бок папрокі ў здрадніцтве, рэнегацтве. Нярэдка танальнасць такіх выказванняў насіла даволі абразлівы характар. Напрыклад, у адным з лістоў (датуецца 28 жніўня 1924 г.) К. Дуж-Душэўскі адзначае, што „ў Берліне ўсё грамадзянства, якое толькі так ці інакш звязана з беларускім рухам, абурана подлым паступкам „жуліка Цвікевіча", як яго тут называюць". „Сярод найідэйнейшых людзей бываюць здраднікі і правакатары, — працягвае далей Дуж-Душэўскі. — Што ж, ёсць правакатары-аферысты і сярод беларусаў, а главаром гэтай шайкі з'яўляецца А. Цвікевіч (...). А вось яшчэ вытрымка з іншага ліста „Пах 2-х мільёнаў літаў, якія гр. А. Цвікевіч і К° ужо лічылі ледзь не атрыманымі ад літвінаў, адурманілі гэтую публіку зусім і яна страціла астаткі розуму і ўсялякага пачуцця этыкі".

Варта адзначыць, што Цвікевіч не быў палітыкам-летуценнікам. Ён не ўскладваў вялікіх спадзяванняў на Літву ў справе адраджэння Беларусі: лічыў супрацоўніцтва з літоўскім урадам часовым, скептычна ставіўся да ідэі супольнай федэратыўнай дзяржавы. Сама рэчаіснасць пацвярджала слушнасць яго сумненняў. Хоць доўгі час Цвікевіч непрыхільна ставіўся да БССР, аднак паступова яго пазіцыя змянілася пад уздзеяннем поспехаў і дасягненняў палітыкі беларусізацыі. І Цвікевіч, нягледзячы на здзеклівыя закіды ў яго бок, не хаваў свайго намеру пераехаць у Мінск. Таму і пайшоў на прыняцце рашэння аб спыненні дзейнасці ўрада БНР і прызнанні Мінска адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі — на Берлінскай канферэнцыі ў

КОЖНЫ НАРОД, АЛЕ ПАСЛЯ БЕЛАРУСІ»

нараджэння Аляксандра Цвікевіча

кастрычніку 1925 г. Аляксандр Цвікевіч рабіў даклад „Аб сучасным моманце ў нацыянальным і дзяржаўным будаўніцтве Беларусі". Прынятыя дакументы, а таксама ліст А. Цвікевіча былі апублікаваны ў прэсе БССР. Быў унесены раскол у шэрагі беларускай палітычнай эміграцыі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што пэўную ролю ў гэтай справе адыгралі савецкія агентурныя органы. З гэтым не пагадзіцца таксама нельга. Аднак Аляксандр Цвікевіч прыняў рашэнне аб вяртанні ў БССР (як і некаторыя іншыя дзеячы) па ўласным жаданні, зыходзячы з ідэйных перакананняў. У адным з лістоў (адрасат невядомы) ад 22 лютага 1925 г. ён прызнаваўся: „Не скрываю, што не ўсім, што ёсць у Менску, я задаволены і што, мне здаецца, шмат што ў працы трэба змяніць (...). Кожны з нас ведае, што сапраўды Менск сёння яшчэ далёкі ад таго, каб быць беларускім".

Пазней, у час турэмнага зняволення ў 1930 г., Аляксандр Цвікевіч у паказаннях згадваў тыя падзеі сярэдзіны 1920-х гадоў. Хоць выказанаму за турэмнымі кратамі нельга поўнасцю давяраць, усё-такі варта звярнуць увагу на асобныя меркаванні. Паводле Цвікевіча, нялёгка было яму псіхалагічна пры прыняцці рашэння ў Берліне. „Для гэтага трэба было перажыць цяжкую ўнутраную барацьбу, рашыцца на папрок у рэнегацтве, у здрадзе „нацыянальнай справе" — папрок, які быў сапраўды кінуты ў твар мне, маім таварышам на наступны дзень пасля рашэнняў Берлінскай канферэнцыі". Ён лічыў, што ліквідацыя БНР не была манеўрам, каб абмануць савецкія ўлады. „Гэта быў зусім паслядоўны палітычны акт, вынік трох прычынаў: абсалютнага і безумоўнага росту БССР, якая ператварылася ў рашучы фактар беларускага вызваленчага руху, нацыянальна-культурнага і дзяржаўнага будаўніцтва; раскол адзінага нацыянальнга фронту ў Заходняй Беларусі ў сувязі з падрыхтоўкай Рабоча-сялянскай грамады; у незацікаўленасці суседніх з Беларуссю буржуазных дзяржаў у існаванні БНР".

У лістападзе 1925 г. Аляксандр Цвікевіч разам з сям'ёй пераехаў у Мінск. Спачатку працаваў кансультантам у Наркамфіне, потым — неадменным (вучоным) сакратаром у Інбелькульце, старшынёй камісіі па вывучэнні асветы ў Беларусі, у Інстытуце гісторыі. Ён ніколькі не адмовіўся ад сваіх нацыянальна-дэмакратычных перакананняў. Невыпадкова, што пазней у турэмных паказаннях Аляксандр Цвікевіч прызнаваў: „застаўся беларускім нацыяналістам, з той розніцай, што свой нацыянальны настрой імкнуўся рэалізаваць і задаволіць не ў старых формах „народнай" Беларусі, а ў новых формах Беларусі савецкай".

У 1929 г. у Мінску была надрукавана фундаментальная навуковая праца Аляксандра Цвікевіча «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.» Па глыбіні даследавання і праблематыцы кніга не страціла свайго значэння і цяпер. Аўтар усебакова прааналізаваў ідэалогію і практыку русіфікацыі Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі. Удумлівае прачытванне гэтай кнігі дае магчымасць знайсці адказ на пытанне чаму і цяпер пэўныя палітычныя сілы ў нашым грамадстве жадаюць бачыць і надалей беларусаў „заходнерусамі". Карані гэтай з'явы бяруць пачатак у змрочныя дзесяцігоддзі сталінскага таталітарнага рэжыму. Невыпадкова, што са згортваннем палітыкі беларусізацыі з канца 1920-х гг. згаданая кніга была забаронена. Увесь тыраж (3000 экземпляраў) быў поўнасцю знішчаны. Уцалела толькі некалькі кніг у прыватных зборах. У 1993 годзе даная праца была перавыдадзена.

Сам Аляксандр Цвікевіч быў арыштаваны 4 ліпеня 1930 г. Яго абвінавачвалі ў прыналежнасці да неіснуючай антысавецкай арганізацыі „Саюз вызвалення Беларусі". Найперш удалося выбіць уласнаручнае прызнанне „вінатавасці". Аднак неўзабаве ён адмовіўся ад яго. Спатрэбілася няшмат часу, каб з дапамогай прымусовых метадаў вязень ізноў пагадзіўся з бязглуздымі абвінавачваннямі. Вось урывак з паказанняў Аляксандра Цвікевіча ад 24 жніўня 1930 г.: „Інакш і быць не магло: маё нацыяналістычнае „нутро", мае нацыянальныя настроі і накіраванасць, натуральна, штурхалі мяне ў нацыянальны лагер. У гэтым і праявілася мая контррэвалюцыйная сутнасць". Гэтая „споведзь" сведчыць аб тым, што чалавек застаўся верным сваім нацыянальна-дэмакратычным поглядам, нягледзячы на самабічаванне, учынены над ім гвалт.

10 красавіка 1931 г. Аляксандр Цвікевіч быў асуджаны на 5 гадоў ссылкі. Адбываў яе ў Пярмі, Ішыме, потым Сарапуле (Удмуртыя). Пазней тэрмін пакарання прадоўжылі на 2 гады. Жыў там разам з сям'ёй — жонкай Зінаідай Осіпаўнай, дзвюма дачкамі (трэцяя дачка — Ірына — памерла ў пачатку 1924 г.) і сынам. Аб знаходжанні ў ссылцы ўспамінае дачка Марына, 1925 г. нараджэння. „Я была занадта малой, каб ведаць якія-небудзь падзеі, што былі да 30 года. Нягледзячы на арышт і ссылку, бацька заўсёды быў вясёлым і жыццярадасным, у яго ўсюды было шмат сяброў, ён добра спяваў, складаў усялякія гісторыі і расказваў мне раніцай у вольны час". Безумоўна, што малая дзяўчынка яшчэ не адчувала той пагрозы, якая навісла над яе бацькам. „У нас збіраліся часта сябры бацькі — вясёлыя, вялікія кампаніі". Магчыма, што дзеля бяспекі дзяцей размовы аб мінулай палітычнай дзейнасці Аляксандр Цвікевіч не вёў. Аднак, як узгадвае яго дачка Марына, „бацька вельмі любіў Беларусь і ў сям'і часта гаварыў па-беларуску". „Калі прыходзілі госці, я часта расказвала вершы на беларускай мове. Адзін з іх я добра памятаю.

Гусі, гусі, вырай вольны
Шумны крык ваш, гусі,
Ляціце вы ў свет раздольны
З нашай Беларусі.

Страшэнныя часы „яжоўшчыны" не абмінулі Цвікевіча. Ізноў звяртаемся да ўспамінаў дачкі Марыны. „У 1937 годзе ноччу за бацькам прыйшлі, усё перарылі, забралі яго кнігі і, мабыць, яшчэ нешта акрамя кніг, бо ў яго была невялікая бібліятэка. Праз тры дні бацька вярнуўся і сказаў маме, каб не хвалявалася. Аднак потым яго зноў забралі. А праз некалькі дзён да нас прыбеглі нейкія жанчыны і сказалі, што Аляксандра Іванавіча павезлі на вакзал. Мы з мамай пабеглі і на вакзале знайшлі вагон, дзе ён быў. Канваір дазволіў нам пагутарыць з ім. Бацька мне сказаў, каб добра здавала экзамены (я заканчвала пяты клас) і ён прывязе падарунак. Болей пра яго мы нічога не чулі".

Арыштаванага Аляксандра Цвікевіча 17 снежня 1937 г. прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання. 30 снежня 1937 г. ён быў расстраляны ў Мінску.

Такі ж лёс напаткаў і яго брата Івана, таленавітага вучонага-медыка. Іван, які быў на тры гады маладзейшы за Аляксандра (нарадзіўся ў лістападзе 1891 г.), пасля сканчэння медыцынскага факультэта Варшаўскага універсітэта ў 1914 г. прымаў удзел у першай сусветнай вайне ў якасці франтавога ўрача. На фронце трапіў у нямецкі палон. Пасля вызвалення працаваў у 1921-1923 гг. у Берліне ў Дзяржвыдавецтве РСФСР. Менавіта тады ён даволі часта кантактаваў з братам Аляксандрам. З 1923 г. працаваў у Мінску. Пазней разам з братам уваходзіў у склад правадзейных членаў Інбелкульта, узначальваў там медыцынскую секцыю. Тэрміналагічная камісія пад яго кіраўніцтвам шмат зрабіла ў галіне распрацоўкі медыцынскай тэрміналогіі, якая выдавалася на лацінскай, рускай і беларускай мовах. Вынікам работы камісіі было складанне шэрагу слоўнікаў, апублікаваных у 1926-1928 гг. У 1926 г. Іван Цвікевіч надрукаваў у Мінску падручнік для сярэдніх школ Анатомія, фізіялогія і гігіена (пераклад з рускай), які быў перавыдадзены ў 1929 і 1930 гг. Акрамя таго, Іван Цвікевіч праявіў сябе як добры знаўца замежных моў — перакладаў на беларускую мову творы Рабіндраната Тагора і іншых. Цікавіўся і айчыннай гісторыяй. У адным з нумароў часопіса „Полымя" (1924 г.) быў змешчаны біяграфічны нарыс пра Кастуся Каліноўскага.

Іван Цвікевіч быў арыштаваны 18 ліпеня 1930 г. Пазней быў асуджаны на 5 гадоў лагераў. Пакаранне адбываў у Нарыме, на Алтаі. 1 ліпеня 1938 г. асуджаны паўторна — да расстрэлу.

Аляксандр Цвікевіч быў рэабілітаваны па першым прыгаворы 10 чэрвеня 1988 г., па другім — 31 мая 1989 г. Рэабілітаваны і Іван Цвікевіч.

Жыццёвыя лёсы дзяцей Аляксандра Цвікевіча былі даволі складаныя. Спасылаемся на ўрыўкі з ліста Марыны Лясковай (Цвікевіч). „Пасля арышту бацькі нас высялілі з кватэры, маму звольнілі з працы, але ў школе я ніякім ганенням не падвяргалася. Брат [Віктар; памёр у Пецярбургу — А. В.] у час арышту бацькі вучыўся ў Ленінградзе ў фізіка-матэматычным інстытуце. Яму ўсё жыццё давялося скрываць, што бацька ў яго арыштаваны".

У цэлым, даны матэрыял ахапіў толькі асноўныя вехі ў жыццяпісе Аляксандра Цвікевіча, яго палітычнай, грамадска-культурнай і навуковай дзейнасці. Аднак нават вышэйпералічанага дастаткова, каб пераканацца ў тым, наколькі шматгранным быў талент Аляксандра Іванавіча Цвікевіча. Удзячныя землякі маглі б з упэўненасцю ўшанаваць яго імя ў назве вуліцы Брэста. Варта было б устанавіць памятныя знакі на будынку, дзе жыла сям'я Цвікевічаў, а таксама на будынку гімназіі, дзе вучыўся Аляксандр Цвікевіч. Гэтае імя сапраўды ўваходзіць у кагорту выдатных ураджэнцаў Берасцейскай зямлі.

Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ,
Брэст

Тэкст падаецца са скаротамі, поўны варыянт глядзі:
http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bzh/14/14biogr_vabiszczevicz.htm

ПАЛЯШУК ІВАН КЛЯЎЧЭНЯ:

Адной з невядомых старонак гісторыі нашай Бацькаўшчыны з'яўляецца пытанне удзелу беларусаў у другой сусветнай вайне ў складзе польскай арміі пад камандаваннем генерала Уладыслава Андэрса. 2007 год у Польшчы быў абвешчаны годам імя гэтага славутага генерала. Беларусы ж сёння амаль зусім не ведаюць пра баявы шлях сваіх землякоў у Арміі Андэрса. Гэтае няведанне сталася вынікам дзеясяцігоддзяў існаваўшай забароны ў савецкім грамадстве на любое крананне азначанай тэмы. Дык што гэта за армія такая і які лёс вайскоўцаў гэтай арміі? На гэтыя пытанні можа адказаць тыповая жыццёвая гісторыя аднаго з "андэрсаўцаў" – паляшука Івана Аляксеевіча Кляўчэні.

Іван Кляўчэня нарадзіўся ў 1912 годзе ў вёсцы Будча сучаснага Ганцавіцкага раёна ў сялянскай сям'і. Яго свядомае жыццё праходзіла ў час, калі Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польшчы. Вёска Івана знаходзілася амаль ля самай мяжы з БССР. І, дарэчы, паміж роднай Будчай і суседняй вёскай Чудзін знаходзіўся памежны корпус польскіх войскаў – Людвікава. Як успамінала жыхарка вёскі Будча Анастасія Дайлід: "У Людвікава войска стаяла, кашары (казармы – *аўт.*), салдаты служылі з усяе Заходняй Беларусі. А як стала вайна (паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 года – *аўт.*), войскі адышлі, дык будчакі ды чудзінцы разабралі тыя цагляныя кашары, некалькі сцен толькі засталося" .

У першай палове 1939 года Іван Аляксеевіч Кляўчэня быў прызваны ў польскае войска і ў складзе батальёна Корпуса Аховы Памежжа "Людвікава" ўдзельнічаў у баявых дзеяннях супраць Чырвонай Арміі. Аднак вельмі хутка трапіў у савецкі палон.

Згодна з рапартам шэфа XII аддзела Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі, у савецкі палон трапілі 4963 беларусы. Пэўная частка з іх была вызвалена, астатнім жа, у тым ліку і Івану Кляўчэні так не пашэнціла (тых, хто служыў у польскіх памежных войсках не вызвалілі), гэтыя палонныя былі накіраваны ў прамысловыя лагеры Народнага камісарыята чорнай металургіі – у Крывы Рог, Данбас і Запарожжа. Да сярэдзіны 1941 года у Ровенскім лагеры знаходзілася 2318 беларусаў, Крыварожскім – 2046, Запарожскім – 400. Да нападу Германіі на Савецкі Саюз лагеры апошняга напоўніліся яшчэ і дэпартаванымі былымі грамадзянамі II Рэчы Паспалітай, колькасць якіх па розных падліках складала да 120 тысяч чалавек.

Генерал Уладыслаў Андэрс

Таму калі ў выніку савецка-польскага пагаднення ад 30 ліпеня 1941 года (пасля нападу Германіі на Савецкі Саюз) на тэрыторыі СССР з польскіх палонных пачало стварацца польскае войска пад камандаваннем генерала Уладыслава Андэрса, многія беларусы не раздумваючы ўступалі ў яго, запісваючыся палякамі. Тое самае ў жніўні 1941 года зрабіў і Іван Кляўчэня, стаўшы вайскоўцам Арміі Андэрса.

Да жніўня 1942 года Армія Андэрса аператыўна падпарадкоўвалася камандаванню Чырвонай Арміі, складалася з 6 пяхотных дывізій і іншых часцей і службаў. Калі гаварыць пра колькасны склад Арміі Андэрса, то ў сакавіку 1942 года яна налічвала 66 тысяч чалавек, а ў ліпені 1945 года – больш за 228 тысяч чалавек.

У сакавіку – красавіку і жніўні 1942 года Армія Андэрса была эвакуіравана на Сярэдні Усход – Іран, Ірак і Палесціну. Там яна аб'ядналася з Польскім войскам на Сярэднім Усходзе ў Польскую армію на Усходзе, якая дзейнічала на тэрыторыі Ірака. А ў чэрвені 1943 года з яе складу быў вылучаны 2-гі Польскі корпус, які на чале з Уладзіславам Андэрсам быў накіраваны ў Паўночную Афрыку.

Паляшук Іван Кляўчэня ў 2 Польскім корпусе ваяваў у складзе 3-яй дывізіі стральцоў карпацкіх. Сярод вайсковых адзінак Другога Корпусу найбольш беларусаў было ў гэтай дывізіі (22 %), а таксама ў 5-й крэсавай дывізіі (45 %).

З Афрыкі ў студзені-лютым 1944 года Армія Андэрса была пераведзена ў Італію. Тут перад саюзнікамі (Брытанія, ЗША, Францыя) паўстала задача прарыву моцных нямецкіх загараджальных ліній "Гітлер" і "Густава", якія перашкаджалі далейшаму наступленню на поўнач. Адным са стратэгічных пунктаў лініі "Густава" быў кляштар Монтэ-Касіна, які знаходзіўся на недаступнай вяршыні гары. У гэтым кляштары бенедыктынцаў размяшчаліся некалькі батальёнаў элітнай 1-й парашутнай дывізіі вермахта. Спробы 5-ай арміі ЗША і 8-ай брытанскай арміі прарыву на поўнач завяршыліся няўдачай і баі зацягнуліся да мая. Страты саюзнікаў склалі звыш 52 тысяч чалавек, з якіх 8340 загінулі.

У маі 1944 года задача прарыву лініі Густава была ускладзена на 2-гі Польскі корпус. 5-я крэсавая дывізія павінна была авалодаць ключавымі кропкамі нямецкай абароны на ўзвышшы Відма (польск. – прывід) і Сан-Анжэла. Тым часам 3-я дывізія карпацкіх стральцоў ішла на штурм кляштара Монтэ-Касіна.

Штурм пачаўся ў ноч з 11 на 12 мая. Немцаў выбілі з пярэдніх ліній абароны, аднак умацавацца не ўдалося. Несучы адчувальныя страты, давялося адступіць і здаць пазіцыі. Чарговая спроба штурму была прызначана на ноч з 17 на 18 мая. Гэтая спроба аказалася паспяховай, над кляштарам узвіўся бела-чырвоны польскі сцяг. Яшчэ некалькі дзён спатрэбілася на здабыццё астатніх нямецкіх пазіцый.

У выніку бітвы 2-гі Польскі корпус страціў 924 чалавекі забітымі, сярод якіх былі 264 ураджэнцы Беларусі. Акрамя таго, варта прывесці лічбы загінуўшых нашых землякоў падчас іншых баталій на Апенінскім паўвостраве: Ларэта – 234, Касамасіма – 72, Балонія – 287, іншыя месцы – 11. Усяго ж ад моманту стварэння Арміі Андэрса загінулі 1583 беларусы.

Сведчаннем адвагі нашых землякоў з'яўляюцца сотні прозвішчаў беларусаў сярод кавалераў Памятнага крыжа Монтэ-Касіна і іншых высокіх узнагародаў.

Іван Аляксеевіч Кляўчэня таксама атрымаў крыж Монтэ-Касіна. Ён удзельнічаў у непасрэдным штурме кляштара ў складзе 3-й дывізіі карпацкіх стральцоў. З успамінаў яго брата, Канстанціна Аляксеевіча нам удалося высветліць што Іван Кляўчэня быў сур'ёзна паранены і трапіў у шпіталь, а па вяртанні на Радзіму "ён вельмі моцна кульгаў". Невядома, праўда, праўда, быў ён паранены пад Монтэ-Касіна, ці пазней, але ледзь не да 1947 года Іван Аляксеевіч знаходзіўся ў шпіталі ў Шатландыі.

Пасля вайны усім жадаючым з Арміі Андэрса прадастаўлялася брытанскае грамадзянства, або магчымасць выехаць у любую краіну свету, у тым ліку і ў СССР. Многія былыя вайскоўцы засталіся, а іншыя, хто меў сем'і, або каго апанавала туга па Радзіме, вярнуліся дадому. На працягу 1946 -1948 гадоў каля тысячы былых вайскоўцаў Арміі Андэрса вярнуліся ў Беларусь.

Іван Кляўчэня вярнуўся ў родную Будчу да сямейнай гаспадаркі з шатландскай вайсковай базы Stewardton ў 1947 годзе. І калі ў 1939 годзе ён сыходзіў у польскае войска з Лунінецкага павета, то цяпер з яго ўжо быў вылучаны Ганцавіцкі раён, жыццё ў якім імкліва мянялася. Паўсюдна, нягледзячы на нежаданне большасці палешукоў, ішла агітацыя за ўступленне сялян у калгасы, якая суправаджалася запалохваннем, дыскрымінацыйнай падатковай палітыкай у адносінах да адзінаасобнікаў а часам нават і рэпрэсіямі.

Да 1948 года ў Ганцавіцкім раёне існавалі толькі 4 калгасы. Аднак ужо ў 1949 годзе быў узяты курс на масавую калектывізацыю сельскай



Канстанцін—брат Івана Кляўчэні. 2006

З АРМІІ АНДЭРСА Ў СІБІР

гаспадаркі і за адзін толькі гэты год у Ганцавіцкім раёне былі ўтвораныя 33 новыя сельгасарцелі.

18 сакавіка 1949 года і ў Будчы быў створаны калгас, які атрымаў назву "Чырвоны партызан". З 295 гаспадарак, якія на той час былі ў вёсцы, на момант арганізацыі ў калгас уступіла 41 сям'я. А па стану на 20 лістапада ў калгасе "Чырвоны партызан" было ўжо 109 сялянскіх гаспадарак. Сведка тых падзей Анастасія Лукашаўна Дайлід на пытанне, як уступалі ў калгас, адказала папростаму і недвусэнсоўна: "Хто сам, а каго за шкірку, ды й цягнуць…".

Сям'я Івана Кляўчэні, нягледзячы на тое, што не была заможнай і не мела шмат зямлі, не ўступала ў калгас. Паводле успамінаў Канстанціна Кляўчэні, гэтага не жадаў бацька Аляксей Аляксеевіч. Трымалі некалькі кароў, коней і жылі са сваёй працы.

У ноч з 31 сакавіка на 1 красавіка 1951 года органы МДБ правялі масавую акцыю па арышце і дэпартацыі разам з сем'ямі былых вайскоўцаў арміі Андэрса ў Іркуцкую вобласць. У якасці асноўнага матыву фігуравалі фармулёўкі: "не браў удзелу ў Вялікай Айчыннай вайне… не мае асаблівых заслугаў перад савецкай радзімай… знаходзіўся ў гады вайны за мяжой… служыў у арміі здрадніка Андэрса". Вядомы прозвішчы 890 андэрсаўцаў, якія былі дэпартаваныя ў Сібір. З іх 285 – адзначаныя памятным крыжам Монтэ-Касіна.

У гэтую самую ноч была арыштаваная і сям'я Івана Кляўчэні. Паводле ўспамінаў Канстанціна Кляўчэні "прыехала НКВД з аўтаматамі. Двое на вуліцы чакалі, а двое зайшлі ў хату. Пачалі брата (Івана – *аўт.*) дапытваць, каб нейкія паперы падпісаў, быццам "изменник Родины". Потым забралі ўсе дакументы і нас усю сям'ю завезлі ў Сібір у Іркуцкую вобласць, Чарамхоўскі раён у пасёлак Кірпічны. Забралі бацьку Аляксея Аляксеевіча, брата Івана, мяне і сястру Вольгу. Бацька і брат працавалі там на цагляным заводзе, а я скончыў школы 4 класы і таксама пайшоў працаваць. У 1953 годзе памёр Сталін, то нас у 1957 годзе вызвалілі і мы вярнуліся ў Беларусь. Сястра ў Сібіры выйшла замуж і пераехала з мужам жыць у Салігорск. Брат памёр яшчэ ў Сібіры, сэрца не вытрымала. То ў вёску прыехалі мы з бацькам удваіх. Вярнуўшыся, даведаліся, што гаспадарку нашу забралі ў калгас, то і я пайшоў у калгас пасвіць жывёлу.

Узнагароды Івана Кляўчэні

Хата наша стаяла, пакуль адрамантавалі, то пажылі ў сваякоў… Па вёсцы праехалі, людзі нам сабралі бульбы, яшчэ нечага, пакрыху развялі. Потым я ажаніўся, а бацька хутка памёр, бо старэнькі ўжо быў…".

Такім чынам, Іван Кляўчэня не дачакаўся вяртання на Беларусь. На сёння не засталося не тое што яго ўзнагародаў, але нават і фотакарткі гэтага чалавека, пражыўшага такое гераічнае жыццё, якое скончылася так трагічна. Не пакінуў гэты чалавек і нашчадкаў. Не паспеў...

А ягоны брат, Канстанцін, які падлеткам спрабаваў збегчы з халоднай Сібіры (ад'ехаў ад Іркуцка кіламетраў ля 100, пакуль яго не знялі і не вярнулі назад), усё ж, як вы прачыталі вышэй, вярнуўся на Радзіму ў 1957 годзе. Але кім ён вярнуўся? "Ворагам народа", юнаком з назаўсёды паламаным жыццём. І ўсё гэта толькі таму, што ягоны брат Іван змагаўся з фашызмам у складзе польскай арміі пад англійскім камандаваннем.

Сям'я Канстанціна Кляўчэні да 2008 года (!) не ведала, што яна рэабілітаваная. Дачка Канстанціна Кляўчэні "пісала заяву ў Ганцавічы" у канцы 90-х гадоў мінулага ўжо стагоддзя, але ніякага адказу не дачакалася. Канстанцін Кляўчэня ж не бачыў у гэтым вялікага сэнсу. Ён жыў сабе з ярлыком "ворага народа", перадаючы яго з пакалення ў пакаленне сваім ўжо ўнукам, адным з якіх з'яўляецца і аўтар гэтага артыкула.

Я ж пачаў даследаваць тэму Арміі Андэрса падчас вучобы на гістарычным факультэце. Падштурхнула мяне да гэтага менавіта імкненне даведацца праўду адносна гісторыі ўласнага роду. Падчас высвятлення акалічнасцей баявога шляху Івана Кляўчэні былі зробленыя пісьмовыя запыты ў аддзел ЗАГС горада Чарамхова Іркуцкай вобласці (дзе сям'я знаходзілася ў ссылцы), а таксама ў аддзел УВД па Брэсцкай вобласці і ў Міністэрства абароны Брытаніі. У выніку, удалося высветліць, што Іван Кляўчэня акрамя польскай узнагароды – Крыжа за бітву пад Монтэ-Касіна № 6524, атрымаў яшчэ і 4 брытанскія медалі: Зорку 1939-1945, Зорку Італіі, Зорку Абароны, Медаль вайны 1939-1945. І ёсць спадзяванні, што брытанскія ўзнагароды сям'я яшчэ зможа атрымаць праз пасольства Вялікабрытаніі.

Павел ДАЙЛІД,
Івацэвічы,

Паселішча Кірзавод № 2 у Іркуцкай Сібіры



СПРАВКА

Даведка аб рэабілітацыі

АДЗНАКА МУЖНЫХ:

Памятны Крыж Монтэ-Касіна — гэта бронзавы крыж, які па форме адпавядае крыжу манахаў-бенедыктынцаў, памерамі 41 х 41 мм. Разнавіднасцей няма, бо ўсе крыжы выраблены адной партыяй у аднаго вытворцы.

Крыж чапляўся на стужку ў колерах манахаў-бенедыктынцаў (5 чырвона-аранжавых і 6 ясна-блакітных палосак). Шырыня стужкі залежала ад таго, дзе яна была зроблена – у Італіі, Брытаніі, альбо Польшчы і вагалася яна ад 32 мм. да 35,5 мм. Стужка злучалася з дапамогай меднага кальца і кручка (узор 1929 года).

Цікава і арыгінальна выглядае планка (барэтка), якую насілі перад уручэннем Памятнага Крыжа Монтэ-Касіна, альбо замест яго. Металічны надпіс Monte Cassino па дыяганалі планкі робіць яе вельмі прывабнай. Планкі выраблялися з розных матэрыялаў у тым ліку і з арганічнага шкла. Сёння

арыгінальная адзіночная планка ўзору 1944 года з'яўляецца даволі рэдкім прадметам.

Пасведчанне да Памятнага Крыжа Монтэ-Касіна друкаваліся ў тыпаграфіі 12 геаграфічнай роты II Польскага корпуса. Аўтар праекта пасведчання змог падкрэсліць манументальнасць адбыўшайся падзеі, узяўшы ў якасці фона дакумента руіны горнага кляштара бенедыктынцаў.

Пасведчанне выраблена з картону 140 х 112 мм. На першай старонцы на шэрай выяве вайсковага арла ў кароне бронзавы аверс Крыжа. Верх і ніз абрамляюць палоскі ў колерах стужкі Крыжа. Над верхняй надпіс: 2 KORPUS POLSKI, пад ніжняй ITALIA 1944. На чацьвёртай старонцы – адзнака II Корпуса – белая Сірэна на чырвоным шыльдзіку. Унізе ясна-шэрая анатацыя аб выканаўцу пасведчання. На другой і трэцяй старонках змешчана інфармацыя аб узнагароджаным, нумар загада, дата уручэння пасведчання, пячатка вайсковай адзінкі і подпіс яе камандзіра. Вядомы так званыя сухія пячаткі: рэльефны адбітак дзяржаўнага герба Рэспублікі Польшча аточаны надпісам: Dowodztwo 2 Korpusu. Такую пячатку мае пасведчанне Васіля Мішкова з 3 палка лёгкай артылерыі 3 ДСК.

Васіль Мішкоў

АНДЭРСАЎЦЫ З БЯРОЗАЎШЧЫНЫ

Прыводзім таксама кароткія біяграмы удзельнікаў Другой сусветнай вайны ў складзе Арміі Андэрса, уражэнцаў сённяшняга Бярозаўскага раёну. Біяграмы прыводзяцца паводле артыкула "Беларусы ў Арміі Андэрса", што быў змешчаны ў бюлетэні "Гістарычная Брама" № 3-4, 1997 г.

Амельяновіч Валянцін Мікалаевіч, нар. у 1911 г., г. Бяроза. У 1932-34 гг. праходзіў службу ў польскай арміі ў 9-м артпалку. У жніўкі 1939-га мабілізаваны, ваяваў на польска-нямецкім фронце па кастрычнік 39 г. у складзе 30-га артпалка. Вярнуўся з фронта і ў 1940-41 гг. вучыўся ў Мінску ў пажарна-ваенна-тэхнічнай школе. З пачаткам вайны школа эвакуіравана ў г. Горкі. Там і запісаўся ў ствараемую армію Андэрса. "Мабілізаваны Горкаўскім РВК у польскую армію 1.42 г., 10-ы артполк, па VII.42 г." - запісана ў ваенным білеце. З VII.42 па VII.45 служыў у 3-м артпалку. Удзельнічаў у бітве пры Монтэ Касіна, а таксама ва ўсіх астатніх аперацыях Другога корпуса. Пры расфарміраванні арміі ў 1945 годзе памешчаны ў спецыяльны лагер для дэмабілізаваных на тэрыторыі Францыі. Каб вярнуцца ў Саюз трэба было чакаць паўгода. Валянцін не мог вытрымаць такога тэрміна, ён рваўся на Радзіму. Для дасягнення сваёй мэты ён з'ехаў з лагера і звярнуўся ў Рым у савецкае консульства, дзе яму дапамаглі і адправілі ў СССР.

А праз 6 год пастановаю "Особого Совещания при МГБ СССР" ад 11 жніўня 1951 г. выселены разам з усёй сям'ёй (жонка Марыя Нікіцічна і 3 дачкі) на спецпасяленне ў Іркуцкую вобласць з канфіскацыяй маёмасці, "За то, что Омельянович В.Н. проходил службу в польской армии генерала Андерса" - запісана ў прыгаворы. 15.02.57 пастанаўленнем судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда БССР рэабілітаваны. Пасля гэтага сям'я змагла вярнуцца ў Бярозу. 26 кастрычніка 1973 года былы салдат II-га корпуса памёр.

Блоцкі Васіль, в. Мар'янова. Пасля расфарміравання арміі Андэрса вярнуўся дамоў. Быў абраны брыгадзірам у калгасе. Расказваў аднавяскоўцам, што бачыў у свеце, дзе і як ваяваў. Мабыць за гэта і быў сасланы разам з сям'ёй у Іркуцкую вобласць. У дарозе памерла дзіця. Адбыўшы ссылку, застаўся там на сталае жыхарства, дзе і памёр у пачатку 90-х.

Богуш Іосіф Мікалаевіч, р. у 1900 г., в. Пясчанка. У 39-м быў мабілізаваны на фронт. Трапіў у палон. Запісаўся ў армію Андэрса, пасля яе расфарміравання вярнуўся дамоў. У красавіку 1951 года па абвінавачванню ў шпіянажы вывезены з сям'ёй у ссылку ў Іркуцкую вобл., з канфіскацыяй маёмасці. Арыштоўвалі і вывозілі традыцыйна - уначы, акружыўшы хату.

Рэабілітаваны ў 1957 годзе, пасля чаго вярнуліся на радзіму, але сваю маёмасць назад не атрымалі. Выехалі на жыхарства ў Польшчу, бо запісаліся палякамі. Там Богуш І.М. у 1967 г. і памёр.

Тоўпік Станіслаў Іосіфавіч, р. у 1918, г. Бяроза. Пасля расфарміравання арміі Андэрса застаўся ў Англіі, дзе пражыў 12 год. У 57-м годзе па запрашэнню бацькі вярнуўся дамоў. Хваля рэпрэсій на той час ужо прайшла, таму сасланы не быў. Памёр у канцы 80-х.

Падрыхтаваў Мікалай СІНКЕВІЧ,
"ГІСТАРЫЧНАЯ БРАМА", №3-4, 1997

ПАМЯТНЫ КРЫЖ МОНТЭ-КАСІНА

Страта ўзнагарод і дакументаў да іх справа даволі рэдкая, але ўсёж такія выпадкі мелі месца і ў II Польскім корпусе. Дзяржаўныя і вайсковыя ўлады прадугледжвалі і такую падзею. Раннія дублікаты ўзнагарод і дакументаў да іх практычна нічым не адрозніваліся ад арыгіналаў. Верагодна, што Крыжоў было выраблена некалькі больш за 50000, прычым "звышнарматыўныя" крыжы не былі пранумераваны. З пасведчаннем было яшчэ лягчэй: новы дакумент выпісваўся згодна з узорам, толькі апошняя лічба года "забівалася" новай, альбо цалкам скрэсліваўся год 1945 і запісваўся новы, злева рабіўся наддрук – DUPLIKAT. На здымку паказана пасведчанне Міхаіла Лоска выдадзенае яму ў 1946 годзе замест страчаных.

Міхаіл Лоска

Па ўсёй тэрыторыі СССР у ноч з 31 сакавіка на 01 красавіка 1951 года разам са сваімі сем'ямі былі арыштаваны ўсе былыя салдаты Польскай Арміі, якая яшчэ зусім нядаўна была альянтам па антыгітлераўскай кааліцыі.

У час арышту ў былых салдат канфіскавалі самае дарагое – узнагароды, як рэчавы доказ належнасці да Польскай Арміі. На жаль, у архівах МУС яны не захаваліся. Вось чаму сёння гэтая памятная ўзнагарода невядомая шырокаму колу людзей.

Дарэчы, рашэнне аб дэпартацыі было зацверджана Асобай Нарадай МДБ СССР толькі 2 чэрвення 1951 года, калі ссыльныя ўжо амаль два месяцы асвойвалі Чарамхоўскі і другія раёны Іркуцкай вобласці. А ўвогуле правялі яны ў ссылцы амаль сем годоў. Яшчэ і сёння ў Прыбайкаллі жывуць нашчадкі "андэрсаўцаў".

Нікіфар Грышкавец у Неапалі (Італія)

Памятны Крыж Монтэ-Касіна не адзіная ўзнагарода нашых землякоў-берасцейцаў за мінулую вайну. Іх мужнасць і гераізм адзначаны самымі высокімі баявымі ўзнагародамі. Аркадзь Каржаневіч узнагароджаны Сярэбраным Крыжам Ордэна Virtuti Militari, Аляксандр Аўдзяйчук – італьянскім крыжам воінскай адвагі Croce al Valor Militare. На сёння вядомы імёны 35 герояў адзначаных Крыжам Валечных, прычым Міхаіл Лоска ганараваны ім двойчы. 10 берасцейцаў узнагароджаны Бронзавым Крыжам Заслуг з мячамі. Дзмітрый Прыбалавец і Мікалай Люкіш узнагароджаны абоімі крыжамі. Амаль усе ўзнагароджаны Медлём Арміі. Брытанскія ўлады таксама узнагародзілі сваіх салдат Зоркай 1939-45, Зоркай Італіі, Медалём Абароны, Медалём Вайны 1939-45. Некалькі чалавек узнагароджаны Зоркай Афрыкі.

У 2004 годзе, роўна праз 54 гады пасля тых маркотных падзей, сын ужо памерлага камбатанта Нікіфара Грышкаўца з Піншчыны звярнуўся ў Упраўленне КДБ Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці і Міністэрства Абароны Рэспублікі Польшча з просьбай аб вяртанні ўзнагарод бацькі і выдачы дублікатаў. Зварот у другую інстанцыю быў абумоўлены тым, што не верылася, што ўзнагароды ў КДБ захаваліся. На шчасце яны захаваліся ў архіве КДБ і вельмі хутка (праз два месяцы) УКДБ па Брэсцкай вобласці ва ўрачыстых абставінах вярнула сыну асабістыя дакументы і узнагароды бацькі. Праз паўгода польскі бок таксама прыслаў камплект дублікатаў дакументаў і ўзнагарод заслужаных Нікіфарам Грышкаўцом у часы вайны.

Познія дублікаты ўзнагарод (2003, 2004) замаўляліся Міністэрствам Абароны Рэспублікі Польшча ў адной з многіх прыватных ювелірна-гравёрных майстэрань Варшавы. Па форме Крыж адпавядае

арыгіналу, мае даволі добрую якасць. Пасведчанне выканана на камп'ютэры, прычым у Нікіфара Грышкаўца нумар узнагароды прастаўлены, а вось у Станіслава Зажыцкага ён адсутнічае, хаця ва ўсіх астатніх афіцыўных дакументах ён маецца, гэта характэрызуе адвольнасць выконваемай работы.

Яўген ГУРЭЎСКІ,
Пінск,

ДЫМ З КОМІНА

Сакавік

Не чакалі яшчэ, але аднаго дня дыхнуў цёплы весні вецер. Снег хутка размяк, раскіс.На небе не стала ніводнага чыстага лапічка просіні: навіслі над зямлёй цяжкія белавата-шэрыя хмары. Сыра, вільготна. Цяжка дыхаць. На адно спадзяванне: заўтра падзьме густы цёплы вецер і зрушыць гэтую суцэльную хмурую масу як на небе, так і на зямлі. І тады мы ўгледзім чысціню высокага блакіту, пачуем звон жвавых ручайкоў.

Шпакі прыляцелі

На дварэ сакавік, і снегу ўжо амаль няма. Час, калі ўвесь свет ва ўладзе высокага вясёлага неба і чыстай празрыстай просіні. Ноччу падмарожвае, і ранак поўніцца ціхім звонам ледзяшоў, хрустам тонкага зеленаватага лёду ў лужынах. Днём лёд растае, і над зямлёю віецца і знікае ў паветры лёгкая пара.

І ўсё ж нечага неставала ў прыродзе, нечага чакалася, моцна хацелася. Гэтае ж нецярпенне бачыў у вачах другіх людзей. І калі аднаго дня ўнучка ўбегла і радасна пракрычала, што прыляцелі шпакі, я зразумеў, што ўсім нам не ставала вось гэтага ўсхваляванага выгуку: "Шпакі прыляцелі!", шпачынага пералівістага свісту, іх хапатлівай рупнасці. Ад гэтага моманту вясна стала паўнавартаснай.

Абмылка

Зранку свежы ветрык і лёгкі, здаровы марозік. Хрумсцяць пад нагамі зледзянелыя глыжы снегу, дрэвы застылі ў мудрагелістых карунках інею, а над галавою глыбокае сіняе неба з далікатнымі ружовымі разводамі на ўсходзе. "Маецца быць харошы сакавіцкі дзень", - так падумалася, калі спяшаўся да дзяцей у школу.

Апоўдні ж, ідучы дамоў, слухаю, як весела і звонка булькаюць, балбочуць сабе ў калдобінах жвавыя ручайкі, а ўся прастора залітая морам залатога жыццядайнага святла. І неяк вольна і поўна дыхаецца.

Дома маці расказвае:

- Гэта вераб'і сёння так цвірыкалі, так стараліся, а я падумала, што жаўранкі, ажно выбегла глядзець.

І ціха, шчасліва смяецца са сваёй абмылкі, мая старэнькая мілая мама. І не памятаю ўжо, калі так і смяялася...

Песня шпакоў

Апоўдні над зямлёю віецца лёгкая, ледзь бачная пара: агніста-шчырае сонца злізвае апошнія астраўкі бліскучага снегу.

Перада мной немалая горба напілаваных дроў, старая разгалістая ігруша пры плоце. На дзічцы шпакоўня і пара сіня-чорных шпачкоў. І я, і яны ў рабоце. Я калю дровы, яны носяць пер'ечка, сухую траву ў шпакоўню. Мы як згаварыліся: калі саджуся адпачываць на калодку я, робяць перапынак у працы і яны.

Бяруся зноў за сякеру я, робяць утульным свой домік яны. Усё нас лучыць. А найболей песня, якую шпакі спяваюць у час адпачынку. Я даўно здагадаўся, што іх песня для мяне. Бо я, шпакі ведаюць, іх удзячны слухач.

Музыка вясны.

З ночы зямлю падмарозіла, яе злёгку пабяліў чысты пухкі сняжок. Досвіткам я збегаў у недалёкі бярозавы гаёк, наламаў бярозавага вецця і цяпер сяджу, вяжу венікі: спатрэбяцца, каб падмесці, апратаць пасля зімы надворак.

А вось і сонца выкацілася з-за ліловa-срэбнай хмары і паплыло ў чысты светлы блакіт высокага неба. Закапала са стрэх. Цікава назіраць, як кроплі збіраюцца ў выемках-канаўках шыфернага даху, большаюць, цяжэюць, ляцяць і разбіваюцца са звонам аб цвёрдую зямлю на дробныя пырскі.

Як прыемна чуць гэты перазвон празрыстых кропель, гэтую светлую музыку вясны!

Шпакі

Сакавіцкая раніца. Чыстая халаднаватая просінь. Лужыны яшчэ зацягнуты цёмна-зялёным лядком, але агністае сонца ўжо запаліла крышталікі інею на маладым вязе, што ўзвышаецца над стромым дахам хаты.

На тонкай вязавай галінцы шпачкі ціхім посвістам вітаюць ранішняе сонейка, вясну, прыхарошваюцца, перабіраюць, чысцяць пер'ечка.

Падышоў дзед Мікіта. І ён любуецца, слухае пярэсвіст шпакоў, пытаецца, ці ведаю, каго дражняць, перакрыўляюць гэтыя вясёлыя гарэзы-перасмешнікі. Я адмоўна ківаю галавой. Дзед тлумачыць:

- Гэта яны кпяць, смяюцца з малога, вечна недаспанага і галоднага пастушка. Ты ано паслухай. "Ніхто не такі, як пастух малы. І дома жарэ, і з сабою бярэ. А прыйдзе дахаты – "дай, маці, есці!"

І мы яшчэ доўга слухаем шпачкоў, паўтараючы за імі прысказку, і рагочам сабе, як блазны... А ўсё ад таго, што на дварэ вясна...

Жаваранак

Вясна. Зазвінеў трапяткі жаўранак. Людзі ўзнялі галовы да неба - і прасвятлелі. Эх, як жа іх пераканаць, што жаўрук будзе спяваць вясну і ўсё доўгае лета…

Часцінка прыроды

Светлы чысты бор, у якім так лёгка, вольна дыхаецца.

Прысеў, прытуліўся да цёмна-бурага камля выносістай сасны. Размарыла на ўжо гарачым красавіцкім сонцы. Задрамаў. Калі прачнуўся, то згледзеў, што ногі мае якраз на мурашыным шляху, і мурашкі ўжо паспелі пераадолець нечаканую перашкоду.

А вось бліскуча-чорны жук зараз дапаўзе да грудзей.

Прыляцеў зеленавата-жоўты матылёк, сеў мне на плячо. Адпачыў — і зноў паляцеў кружляць у паветры. Гарэзліва падумаў: "Вось я і папраўдзе стаў часцінкай прыроды".

Алесь ЗАЙКА,
в. Заполле, Івацэвіцкі р-н

ДУША БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

Самы мілы сэрцу куток беларускага краю – палац Пуслоўскіх, што блізу Косава. Ён здзіўляе сваёй прыгажосцю і веліччу, але асабліва ўражвае прырода гэтых мясцін. Маленькія дрэўцы, травы, кветкі, якія прабіліся праз каменныя сцены палаца, робяць яго жывым і ўтульным.

Вакол палаца расцягнуўся вялікі загадкавы лес, які вабіць да сябе чароўнымі птушынымі спевамі. Павольнае пагойдванне вершалін дрэў супакойвае і надае адчуванне свабоды. Асабліва гасцінны гэты лес, калі ў цяні дрэў заўсёды можна знайсці прытулак ад летняй спякоты. Іншы раз здаецца, што і сонейка тут нейкае другое: заўседы пяшчотнае, заўседы ласкавае. Побач з палацам плёскаецца чыстае возера.

Спачатку возера здаецца непрыкметным і нецікавым, але разумееш, што памыляўся, калі падыходзіш бліжэй, да самага берага. Хвалі з ціхім шолахам коцяцца на бераг. Раніцай, калі з'яўляюцца першыя промні сонца, вада зіхаціць рознакаляровымі іскрамі. А на беразе, у зарасніку чароту, гняздзяцца птушкі і выводзяць тут сваё патомства, для іх гэта возера – родны кут. Адвячоркам вялікае чырвонае сонейка фарбуе ваду ў пунсовыя і ружовыя каляры. А ў вячэрнім небе ціхенька з'яўляюцца першыя баязлівыя зоркі.

Глядзіш на ўсю гэту прыгажосць і кожны раз здзіўляешся гэтым, нібы акварэльным пейзажам роднай краіны. Зараз здаецца, што мелі рацыю нашыя продкі, калі гаварлі, што ў прыроды ёсць душа. І менавіта тут адчуваецца самабытная душа Берасцейшчыны.

Наста МІРАНОЎСКАЯ з Барысава

ТЭЛЕКАНАЛ "БЕЛСАТ"

— беларускай мовай са спадарожніка

Мы жывем у эры інфармацыйных тэхналогій, калі валоданне інфармацыяй з'яўляецца крыніцай поспеху і задавальнення прагі ісці ў адзін крок з часам. Найбольш актыўныя людзі ўвесь час знаходзяцца ў пошуку новых крыніц інфармацыі.

"Белсат" – першы незалежны тэлеканал у Беларусі. Ён пачаў трансляцыю год таму, 10 снежня 2007 г., у Сусветны дзень правоў чалавека. "Белсат" — гэта тэлебачанне, створанае беларусамі для беларусаў, на іх роднай мове. Транслюецца ён штодзённа ад 18:00 да 24:00 паводле беларускага часу.

ПРАГРАМА.

Над праграмаю працуе некалькі дзесяткаў журналістаў у Беларусі, Польшчы і Літве. "Белсат-TV" — гэта тэлебачанне шырокай тэматыкі, а ў ім:

ІНФАРМАЦЫЯ. Інфармацыйны сервіс "Аб'ектыў" — навіны без цэнзуры. Аб'ектыўная і дакладная інфармацыя пра сітуацыю ў краіне і блізкім замежжы. Разнастайнасць меркаванняў і поглядаў.

ПУБЛІЦЫСТЫКА. Палітыка, права і эканоміка без сакрэтаў. У студыі "Белсату" — гарачыя дыскусіі, у эфіры — агляды незалежнай прэсы, адукацыйна-даведныя праграмы, у тым ліку эканамічныя. Галоўныя публіцыстычныя перадачы: "Форум", "Госць "Белсату", "Маю Права".

ДАКУМЕНТАЛІСТЫКА І РЭПАРТАЖЫ. Гісторыя і сучаснасць. Белыя плямы ў гісторыі Беларусі, культурныя і цывілізацыйныя дасягненні беларускага народу. У праграме таксама замежная дакументалістыка і рэпартажы.

ФІЛЬМЫ І СЕРЫЯЛЫ. Найлепшыя еўрапейскія кінастужкі ды найцікавейшыя серыялы апошніх гадоў, напрыклад, польскія "Афіцэр", "Мент", амерыканскі "Элі Макбіл", а таксама дасягненні беларускай і сусветнай кінематаграфіі.

ЗАБАВА. Беларускі рок, хіп-хоп, андэрграўнд. Найноўшыя кліпы, інтэрв'ю і канцэрты тых, каго не паказваюць афіцыйныя медыі.

Падключыцца да "Белсата" нескладана: патрэбна набыць толькі спадарожнікавую антэну і накіраваць яе на спадарожнік "SIRIUS" (пазіцыя 5°E, палярызацыя H, частата 12 379,6 MHz) або "Astra 1Kr" (пазіцыя 19,2°E, палярызацыя H, частата 10 773 MHz).

Прасцей за ўсё не круціць антэну самому, а проста папрасіць майстра, у якога вы набываеце "талерку", каб ён гэта зрабіў. І наколькі мы ведаем з уласнага досведу, івацэвіцкія майстры ўжо навучыліся гэта рабіць. Таму паспяшайце за "талеркай" і глядзіце "Белсат"!

Павел ДАЙЛІД, Івацэвічы

СПОРАЎСКІЯ ПОКАЗКІ

Вязуць сыны памерлага бацьку на могілкі. А пан едзе. Мінаючыся, зачапіў пан сялянскі воз. Нябожчык вываліўся. Гвалт.

- Навошта, пан, нашага бацьку забіў!

Пан, каб адкупіцца, грошы вялікія даў.

Едуць далей сыны і гавораць паміж сабой:

-О, не быў бы то родны бацька, і мёртвы пра нас дбае.

*****

Багаты споравец у беднага спораўца ўкраў лемех з плуга. Бедны споравец падаў на багатага ў суд. На судзе багаты споравец сказаў: "Я не краў. Гэта мышы лемех з'елі". І суддзя яму паверыў.

*****

Калі да спораўца прыходзілі стрыгчыся, то дзядзька пытаўся:

- А куды цябе стрыгчы? У царкву ці на скокі?

Калі адказвалі, што ў царкву, стрыг добра, бо ў царкве стаяць патыліца за патыліцай. Калі ж на скокі, то стрыг абы-як: усё роўна круцяцца, не разгледзяць.

*****

Пра спораўца, які абы-як малаціў збажыну, казалі:

- О, тваю салому будуць свінні есці.

*****

Спораўцы скажуць:

- Гэта ж твой бацька, як валы краў, то хлявы зачыняў, а ты хаты зачыніць не хочаш.

*****

Споравец з вайны прыйшоў, мяшок скінуў, ды не каб у хату бегчы, жонку абняць, дзяцей. У хлеў пайшоў глядзець, ці конь дагледжаны.

*****

На каляровай паштоўцы – раённы Дом Саветаў.

Спораўца гэта надта ўражвае.

Круціць, разглядае паштоўку, а пасля гаворыць:

- Але ж начальнікаў тут, як мышэй у стозе.

У спораўца пытаюцца, куды гэта ён нясе радыёпрыёмнік.

Споравец адказвае:

- У рамонт.

- Чаму?

- Сапсаваўся. Бо цэлы дзень адно і чую словы цаліна, адраджэнне ды малая зямля.

*****

Адзін споравец узяў і пайшоў у заклад з другім спораўцам.

- Вось зайду ў прыёмны пакой Першага сакратара камуністычнай партыі, прастаю там цэлы дзень і мяне ніхто не спытае, чаго стаю.

І другі споравец прайграў першаму бутэльку рускай гарэлкі.

*****

Стаяць спораўцы каля магазіна, чакаюць, калі хлеб прывязуць. Паўз іх прайшоў начальнік і не паздароўкаўся. Нехта з грамады заўважыў:

- Гэты начальнік горшы за свінню. Свіння і то рохне да людзей.

Пачуў гэтыя словы начальнік, вярнуўся і пачаў моцна лаяцца.

Тады спораўцы сказалі:

- О, гэтая свіння з сабакам спіць.

*****

Запыняе міліцыянт спораўца, бо той парушыў правілы вулічнага руху, і збіраецца аштрафаваць. Як споравец ні просіць аб дараванні:

- Я табе, - урэшце кажа споравец, - пакажу чалавека, які мае аўтамат.

"Ого! – падумаў сяржант, - відаць, хутка я стану лейтэнантам".

І патрабуе, каб парушальнік не марудзіў і як найхутчэй паказаў на чалавека з ружжом.

- І тады не дасі штрафу? – перапытвае споравец.

- Ды не, не! Хутчэй вядзі! – загадвае нецярплівы міліцыянт.

Парушальнік-споравец прывёў і паказаў сяржанту воіна-вызваліцеля з аўтаматам у руках.

Як юшку на гадавое свята гатуюць у Спораве, каб усім хапіла?

Вакол возера распальваюць вогнішчы, а адзін споравец усё ездзіць на лодцы і вяслом памешвае юшку.

*****

- Чаму спораўцы агуркі соляць у бочках, а не ў слоіках?

- Бо галава не ўлазіць, каб есці іх, - смяюцца спораўцы.

*****

Пра аднаго спораўца ў Спораве кажуць:

- У яго ўсё крадзенае, у яго толькі ікона купленая.

*****

Граматны споравец узяў ды падлічыў, колькі курыца за год з'ядае зерня. Скончыў падлік, ажно за галаву ўзяўся: няма выгады. Перастаў курэй трымаць. Потым споравец пасля рупных падлікаў звёў у гаспадарцы карову, свіней, сабаку, ката. Цяпер адукаваны споравец — пралетар.

*****

Паехаў споравец па сена. Убачыў гэта памаўзлівы поп-сусед ды шмігіць да яго жонкі. Але чула сэрца чалавека нядобрае. З паўдарогі вярнуўся і застаў абаіх на гарачым учынку. Даў перцу жонцы, а папа кінуў у яму. А там стаялі два мяхі зерня ды ляжалі два камяні.

- Вось, - кажа чалавек, - сатрэш на муку зерне, то тады выпушчу на волю.

Пабедаваў поп ды давай церці тое жыта. Доўга працаваў, пакуль усё не перамалоў.

Прайшоў час. Аднаго дня суседка ўбачыла папа ды кліча да сябе на пагулянку. А поп у адказ:

- Што? Ужо мука скончылася?

Показкі сабраў і прадаставіў да друку краязнавец Алесь ЗАЙКА, в. Заполле Івацэвіцкага раёна

Рэха Берасцейшчыны
Гісторыка-культуралагічны бюлетэнь
№2 снежань 2008

Рэдактар: Павел ДАЙЛІД
- Кантактныя тэлефоны: +37529 522-82-30, +37529 992-28-30
- E-mail: dajlid@mail.ru
- Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
- Пры перадруку матэрыялаў бюлетэню спасылкі на крыніцу абавязковыя
- Наклад 299 асобнікаў

- Распаўсюджваецца бясплатна
- Падпісана ў друк 26.12.2008 г.
- Папера афсетная, фармат А4